ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
28 ВЕРАСНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №187 (28551)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



«Мазгавы штурм» — на «дзясятачку»



Будні маладога хірурга



Беларускі Сталыпін

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЕРЫН, намеснік начальніка вучэбна-трэніровачнага цэнтра БелАЭС:**

*«Сёння на станцыі працуе 1081 чалавек, з іх 200 маладых спецыялістаў, якія ў апошнія гады прыходзілі да нас на работу. З кожным годам патрэба ў такіх спецыялістах расце. Калі ў 2013 годзе было працаўладкавана 8 чалавек, то ў гэтым годзе — ужо 73 чалавекі. У 2018-м плануецца прыняць на работу каля 120 маладых спецыялістаў з розных ВНУ — БДУ, БНТУ, універсітэта імя Сахарава».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.09.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9614 ▲ |
| Еўра | 2,3033 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0337 ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0740 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Івянецкія рыштаванні



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Будаўнік, майстар па бляхарных работах брыгадзір Уладзімір БЯРНАЦКІ ўдзельнічае ў рамонтна-рэстаўрацыйным аднаўленні помніка беларускага дойлідства — касцёла Святога Міхаіла Архангела ў Івянцы Валожынскага раёна.

■ Заканатворчасць

## АСНОВА ДЛЯ РУХУ НАПЕРАД

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА напярэдадні восеньскай сесіі парламента даў інтэрв'ю «Звяздзе»**

**— Уладзімір Паўлавіч, 2 кастрычніка адкрываецца трэцяя сесія Палаты прадстаўнікоў. На яе пачатку ў цяперашняга дэпутацкага корпуса адметная дата — год парламенцкай працы. Што вы лічыце найбольш значным у стартавай дзейнасці дэпутатаў?**



— Сапраўды, гэта быў стартавы перыяд для новага парламента. Нам трэба было найперш наладзіць нашу дзейнасць арганізацыйна, вызначыць яе змястоўныя прыярытэты, і мы гэта зрабілі дастаткова аператыўна. Нававыбраныя дэпутаты без раскачкі ўключыліся ў заканатворчы працэс. Адзначу вялікую экспертна-прававую работу па законапраектах, якую праводзяць пастаянныя камісіі. На працягу першай і другой сесій мы прынялі 53 заканадаўчыя акты ў другім чытанні і ў першым — 30. Сярод іх — рэзанансныя рашэнні па наспелых пытаннях стымулявання інвестыцый, развіцця дзяржаўна-прыватнага партнёрства, удасканалення судовай сістэмы, аховы здароўя, даступнасці сацыяльных паслуг.

Хацеў бы таксама зрабіць акцэнт на тым, што нававыбраныя дэпутаты актыўна ўвайшлі ў фармат міжнароднага і міжпарламенцкага супрацоўніцтва Нацыянальнага сходу. У складзе парламенцкіх дэлегацый яны падключыліся да работы 13 міжнародных парламенцкіх структур.

СТАР. 2

■ Наш горад

## БУДОЎЛІ ТЫСЯЧАГОДДЗЯ

### У Брэсце распачата падрыхтоўка да юбілею

**Што галоўнае для паспяховага жыцця і функцыянавання інфраструктуры любога горада? Масты і дарогі. Без іх немагчымы нармальная работа транспарту і розныя віды стасункаў з усімі наступствамі. Вось і пры распрацоўцы плана па святкаванні 1000-гадовага юбілею Брэста былі вызначаны найбольш значныя «аб'екты ўвагі» — Заходні абход і Кобрынскі пуцеправод.**

### Транспартная развязка

Заходні абход Брэста — гэта маштабны праект, які стартаваў яшчэ пяць гадоў таму. Першая яго чарга была паспяхова ажыццёўлена, яе вынікам стала адкрыццё ў 2014 годзе шасціпалоснага аўтамабільнага моста цераз раку Мухавец у раёне Брэсцкай крэпасці.

Рэалізацыя другой чаргі праекта пачалася ў першыя месяцы бягучага года. Будаўнікі ўзяліся за ўзвядзенне пуцеправода цераз чыгунку ў выглядзе кальца, якое абапіраецца на калоны і мае шэраг прамянёў-з'ездаў. Агульная даўжыня бетоннага тытана складзе прыкладна тры кіламетры. Эстакада ўзводзіцца над пяццю чыгуначнымі пераездамі на перасячэнні шасці гарадскіх вуліц.




СТАР. 13

# АСНОВА ДЛЯ РУХУ НАПЕРАД

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Створана 72 рабочыя групы і камісіі па супрацоўніцтве з замежнымі парламентамі. У нас даволі шчыльны парадак двухбаковых кантактаў. Геаграфія іх пашыраецца і ў Еўропе, і ў Азіі, і ў Афрыцы, і на амерыканскім кантыненце. Асаблівую ўвагу ўдзяляем інтэграцыйным праектам — Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі і Еўразійскаму эканамічнаму саюзу, развіццю міжпарламенцкіх адносін з краінамі СНД.

Яшчэ адзін вельмі важны сегмент нашай дзейнасці — выбарчыя акругі, умацаванне зваротнай сувязі з выбаршчыкамі. Мы паставілі перад дэпутацкім корпусам задачу забяспечыць пастаянную, прадукцыйную работу ў сваіх акругах, і многія дэпутаты маюць ужо істотныя напрацоўкі. Так што імкнёмся працаваць вынікова.

**— Якія падзеі мінулага парламенцкага года, на ваш погляд, з'яўляюцца самымі яркімі?**

— Выступленне Прэзідэнта ў Авальнай зале парламента са штогадовым Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу і 26-я сесія Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, якая ўпершыню адбылася ў Мінску.

Пасланне кіраўніка дзяржавы — гэта аб'ёмны і разам з тым канкрэтны погляд на эканамічную і сацыяльную сітуацыю ў краіне і міжнародныя адносіны, арыенцір для заканатворчай дзейнасці. Акрэсленыя Прэзідэнтам першарадныя задачы і новыя ідэі пераводзяцца на мову законаў, увасабляюцца ў карэкціроўцы нарматыўна-прававой базы і ў прыярытэтах парламенцкай дыпламатыі. Нашы замежныя калегі ўжо мелі магчымасць на пляцоўках міжнародных парламенцкіх структур, асабліва Парламенцкай асамблеі АБСЕ, пераканацца, што беларускі парламент паслядоўна выступае за паглыбленне партнёрства і ўзаемадзеянне па пытаннях міжнароднай бяспекі. Менавіта значны ўклад Беларусі ў гарантаванне міру і бяспекі ў рэгіёне стаў вырашальным фактарам рашэння ПА АБСЕ правесці летнюю сесію ў нашай сталіцы. На ёй была засведчана цвёрдая пазіцыя Рэспублікі Беларусь усямерна садзейнічаць пошуку шляхоў умацавання міжнароднага даверу і супрацоўніцтва па актуальных праблемах сучаснасці. Удзельнікі вялікага парламенцкага форуму пазітыўна ўспрынялі ініцыятывы нашага Прэзідэнта па правядзенні міратворчых перагавораў Хельсінкі-2.

**— У цяперашнім дэпутацкім корпусе Палаты прадстаўнікоў пабольшала прадстаўнікоў партый і грамадскіх аб'яднанняў. Значыць, у парламенцкіх сценах загучала больш альтэрнатыўных думак і дыскусій?**

— Альтэрнатыўныя думкі і дыскусіі ў парламенце былі заўсёды, ва ўсіх скліканнях. Яны гучаць на пасяджэннях пастаянных камісій, рабочых груп па падрыхтоўцы законапраектаў, у Авальнай зале, у тым ліку падчас адказаў членаў урада на пытанні дэпутатаў, на нашых парламенцкіх слуханнях, круглых сталах і іншых мерапрыемствах. Гэта неад'емная рыса парламентарызму і яго развіцця, бо для дэпутата вельмі важна адчуваць пульс праблем і прапаноўваць рэальныя шляхі іх вырашэння. Але персанальнае ўспрыняцце спрэчак, сутыкнення меркаванняў і іх трактоўка ў СМІ розныя, што натуральна, таму што ўсе мы розныя. Нававыбраны дэпутат прыходзіць у парламент са сваімі поглядамі, уяўленнямі, са сваім бачаннем рэгіянальных праблем і сітуацыі ў краіне і імкнецца гэта выказаць на парламенцкіх пасяджэннях, у сродках масавай інфармацыі. Ніхто гэтага не забараняе. Аднак тую ці іншую прапанаваную навацыю толькі тады можна назваць альтэрнатывай, калі яна абгрунтавана практычна, а не ў тэарэтычных абстракцыях, мае рэальную жыццёвую аснову і можа быць рэалізавана ў рамках прававога поля.

Важна, што ў дэпутатаў ёсць жаданне эфектыўна працаваць. Яны маглі пераканацца ў неабходнасці канструктыўнай работы, набылі першы вопыт узаемадзеяння і супрацоўніцтва ў заканатворчым працэсе, сумеснага пошуку аптымальных заканадаўчых рашэнняў. Мы будзем яго нарошчваць, — задач перад намі стаіць многа.

**— І што на першым плане?**

— Якасная прапрацоўка законапраектаў. Упор зроблены на паглыбленні іх зместу з пункту гледжання адпаведнасці прыярытэтам дзяржаўнай палітыкі, каб законы, якія мы прымаем, былі своечасовымі, канкрэтнымі і максімальна карыснымі рэгуляваным сферам, грамадству і дзяржаве. Пашыраем практыку «нулявога чытання», удзел экспертаў у абмеркаванні заканадаўчых ініцыятыў, кансультуемся са спецыялістамі-практыкамі, навукоўцамі, узгадняем пазіцыі з міністэрствамі і грамадскімі арганізацыямі.

**— Якая тэматыка будзе прыярытэтам восеньскай сесіі?**

— Галоўная тэма — рэспубліканскі бюджэт на 2018 год. Да бюджэтнага працэсу парламентарыі далучыліся яшчэ вясной, працуюць разам з урадам. У Палаце прадстаўнікоў праведзены семінар па арганізацыі бюджэтнага працэсу. Думаю, гэта дазволіць нам прыняць усебакова ўзважаны, збалансаваны фінансавы дакумент, які забяспечыць жыццядзейнасць краіны па ўсіх напрамках сацыяльна-эканамічнага развіцця.

У цэнтры ўвагі дэпутатаў пытанні эканомікі, нацыянальнай бяспекі, абароны, барацьбы з тэрарызмам, праваахоўнай дзейнасці, працоўных адносін. Плануем абмеркаваць у другім чытанні змяненні і дапаўненні ў прававую базу закупак тавараў (работ, паслуг), дзяржаўна-прыватнага партнёрства, процідзеяння манапалістычнай дзейнасці і развіцця канкурэнцыі, абароны правоў спажыўцоў. Узгадненні да першага чытання праходзяць законапраект аб неплацежаздольнасці і банкруцтве, папраўкі ў Банкаўскі кодэкс, у законы аб імянных прыватызацыйных чэках, аб Нацыянальнай акадэміі навук, аб абыходжанні з жывёламі і іншыя заканадаўчыя акты. Яны маюць як эканамічную, так і сацыяльную значнасць. Будзе зняты шэраг прабелаў у прававым рэгуляванні розных сфер грамадскага жыцця.

Мы працягнем нарошчваць дагаворна-прававую базу міжнароднага супрацоўніцтва нашай краіны. Адзначу меркаванне адбыцца ратыфікацыю Дагавора аб Мытным кодэксе Еўразійскага эканамічнага саюза і пагадненняў аб фінансаванні трансгранічнага супрацоўніцтва па праграмах Еўрапейскага саюза «Латвія — Літва — Беларусь» і «Польшча — Беларусь — Украіна».

**— Па якой траекторыі змяненні ў заканадаўстве абнаўляюць эканамічнае асяроддзе?**

— Новыя прававыя меры стымулюючы развіццё дзелавой ініцыятывы, малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, інавацыйную дзейнасць і экспарт. Сур'ёзная заканатворчая праца чакае нас у сувязі з беспрэцэдэнтнымі комплекснымі зменамі ў рэгуляторным полі бізнесу, накіраванымі на аптымізацыю ўмоў яго дзейнасці.

**— Цікава, колькі законаў разлічваеце прыняць на восеньскай сесіі?**

— Ніякіх лічбавых паказчыкаў мы не плануем. У парадак дня сесіі ўключаем законапраекты, якія ўжо гатовы або маюць высокую ступень падрыхтаванасці да абмеркавання ў Авальнай зале. Галоўнае для нас, каб яны былі якаснымі, адпавядалі актуальным развіцця краіны і садзейнічалі паляпшэнню дабрабыту простых людзей. Сесія пройдзе менавіта ў такім ключы.

**— У парламентах некаторых сумежных з Рэспублікай Беларусь краін усур'ёз стаіць праблема прагулаў дэпутатамі сесійных пасяджэнняў. Такога пытання ў Палаце прадстаўнікоў не існуе, прычым усе гады вашага старшынства. Чаму?**

— Усё залежыць ад арганізацыі парламенцкай работы і адказнасці дэпутатаў, — сутнасць у гэтым. У нас калі нехта прапускае пасяджэнне ў Авальнай зале, то ёсць уважлівая прычына, якую дэпутат паведамляе.

**— Новы парламент даў нямала інфармацыйных падстаў, асабліва ў сваёй міжнароднай і міжпарламенцкай дзейнасці. Даволі частымі сталі перагаворы ў Палаце прадстаўнікоў з парламенцкімі дэлегацыямі іншых краін і замежныя візіты дэлегацый Нацыянальнага сходу. Як вы лічыце, у свядомасці еўрапейскіх парламентарыяў па-ранейшаму пераважае ўяўленне пра нашу Беларусь як пра краіну для павучанняў?**

— Наша міжпарламенцкае ўзаемадзеянне на аснове прагматызму і здаровага розуму робіць толькі першыя крокі. Відавочна, яно мае значны патэнцыял і ўвязваецца з перспектывамі беларуска-еўрапейскага партнёрства ў цэлым. Каб ачысціць шлях да сапраўды ўзаемавыгадных, карысных абодвум бакам адносін, неабходна адкрыць у іх новую старонку і напаўняць яе ўзаемным даверам і супрацоўніцтвам. Мне думаецца, разуменне гэтага становіцца ўсё больш пашыраным сярод еўрапейскіх парламентарыяў. Перш за ўсё трэба развіваць палітычны дыялог, напаўняць новым зместам эканамічныя стасункі, пашыраць навуковыя, культурныя і гуманітарныя кантакты. 26-я сесія Парламенцкай асамблеі АБСЕ і іншыя міжнародныя мерапрыемствы, праведзеныя сёлета ў краіне, пераканаўча паказалі нашу адкрытасць да міжнароднага супрацоўніцтва, уменне Рэспублікі Беларусь правільна рэагаваць на ўнутраныя праблемы і тыя выклікі, з якімі сутыкнуўся Еўрапейскі саюз. Ёсць аснова для далейшага руху наперад.

**Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.**
*filimonau@zviazda.by*

■ Дыялог бізнесаў

# У ПОШУКАХ РЭАЛЬНАГА ВЫНІКУ

**У Мінску бізнесмены Беларусі і Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў шукалі новыя магчымасці для кааперацыі падчас трэцяга пасяджэння беларуска-эмірацкага дзелавога савета.**

Як адзначыў **старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты (БелГПП) Уладзімір УЛАХОВІЧ**, у дзвюх краін ёсць усе магчымасці для павелічэння тавараабароту. «Наш гандаль сёння складае каля 30 млн долараў. Пры гэтым імпартны партфель ААЭ ацэньваецца ў 246 млрд. Перад намі велізарныя перспектывы, бо на дзяржаўным узроўні ўстаноўлены канструктыўныя адносіны. Зараз задача бізнесу ў тым, каб іх капіталізаваць і атрымаць рэальны вынік», — растлумачыў Уладзімір Улаховіч.

На яго думку, у магчымых напрамках эканамічнага супрацоўніцтва дзвюх краін асаблівае месца займае мадэрнізацыя і ўкараненне новых тэхналогій у айчынны прамысловы сектар, машынабудаванне. «Безумоўна, уяўляюць цікавасць і інвестыцыі ў беларускі аграрны сектар і вытворчасць прадуктаў харчавання, паколькі арабскія партнёры фактычна татальна іх імпартуюць», — лічыць кіраўнік БелГПП.

Ён таксама заўважыў, што арабскія партнёры перажывалі на глабальным рынку складанасці ў сувязі з падзеннем коштаў на нафту. Таму яны працуюць над дыверсіфікацыяй бюджэту. «Яны хочуць ствараць сумесныя вытворчасці. Магчыма, спачатку гэта будуць зборачныя вытворчасці, а затым сумесныя прадпрыемствы з высокім узроўнем лакалізацыі», — сказаў ён. Перспектыўным напрамкам Уладзімір Улаховіч назваў таксама супрацоўніцтва ў сферы нафтахіміі.

«У рамках перагавораў мы разгледзім магчымасці супрацоўніцтва, рэалізацыі праектаў і стварэння сумесных прадпрыемстваў у прыватным сектары. Я бачу прагрэс і актывізацыю ўзаемадзеяння дзвюх краін. У нас добрыя адносіны на ўсіх узроўнях. Чакаецца паступальны рост тавараабароту, што яшчэ больш умацуе наша ўзаемадзеянне», — выказаў меркаванне **генеральны сакратар Федэрацыі ГПП ААЭ ХУМЕЙД МУХАМЕД БЕН САЛЕМ**. Таксама ён расказаў, што будучы ўдзел беларускай нацыянальнай экспазіцыі ў выстаўцы «Экспа Дубай — 2020» стане дадатковай магчымасцю для прасоўвання беларускіх тавараў на сусветны рынак.

Падчас трэцяга пасяджэння беларуска-эмірацкага дзелавога савета таксама прайшла кантактна-кааперацыйная біржа паміж прадстаўнікамі беларускіх і эмірацкіх дзелавых колаў. З боку ААЭ прыехала 20 кампаній, занятых у будаўніцтве, турызме, сельскай гаспадарцы.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ЗША прыступілі да пабудовы ўзораў для сцяны на мяжы з Мексікай

Будаўніцтва васьмі ўзораў бар'ераў, якія маюць намер усталяваць на мяжы з Мексікай, пачалося ў горадзе Сан-Дыега. Пра гэта паведаміла служба мытнага і пагранічнага кантролю ЗША. Чатыры ўзоры зробяць з бетону, астатнія — з іншага саставу, аб якім не паведамляецца. Усе яны будуць прыкладна ад 5 да 9 метраў у вышыню. «Завяршэнне будаўніцтва ўзораў чакаецца на працягу 30 дзён», — гаворыцца ў заяве амерыканскай службы. Як вядома, сцяна на мяжы з Мексікай — адно з ключавых перадвыбарных абяцанняў цяперашняга прэзідэнта ЗША Дональда Трампа. Указ аб яе стварэнні ён падпісаў яшчэ 25 студзеня, працягласць сцяны павінна скласці больш за 3 тыс. км.

### У паўднёвых штатах Бразіліі задумаліся аб правядзенні рэферэндуму аб незалежнасці

Тры паўднёвых штата Бразіліі плануюць 7 кастрычніка правесці кансультацыю з грамадзянамі пра магчымасць рэферэндуму аб незалежнасці налета, паведаміў РІА Навіны адзін з лідараў руху Sur Libre («Свабодны Поўдзень») Селса Дэўшэр (Celso Deucher). «Мы адчуваем жахлівую страту рэсурсаў і заўсёды дрэннае размеркаванне падаткаў, гэта пакідае нас без надзеі на будучыню пад кіраўніцтвам Бразіліі», — заявіў Дэўшэр. Гаворка ідзе пра тры бразільскія штаты — Санта-Катарына, Парана і Рыу-Гранды-ду-Сул, колькасць насельніцтва якіх складае 29 мільёнаў чалавек. Паведамляецца, што ў гэтых тэрытарыяльных адзінках самыя высокія даходы на душу насельніцтва ў краіне.

### У Саудаўскай Аравіі жанчынам дазволілі кіраваць машынай



Адпаведны ўказ падпісаў кароль Салман ібн Абдул-Азіз аль Саўд, перадае Al-Arabiya. Дагэтуль краіна была адзінай у свеце, дзе ў жанчын не было такога права. «Прымаючы пад увагу негатыўныя наступствы таго, што жанчыны не могуць кіраваць аўтамабілем, улічваючы станоўчыя аспекты вырашэння праблемы, а таксама спасылаючыся на меркаванне старэйшын, у мэтах гарантавання бяспекі грамадства лічым легітымным выдачу пасведчанняў кіроўцы як мужчынам, так і жанчынам», — адзначаецца ў каралеўскім указе, распаўсюджаным афіцыйным саудаўскім інфармацыйным агенцтвам SAP.

### Твітар удвая павялічыць ліміт даўжыні паведамленняў




Спецыялісты сацыяльнай сеткі Твітар выпрабоўваюць новую функцыю, якая дазволіць размяшчаць у ёй паведамленні аб'ёмам да 280 знакаў. Пра гэта гаворыцца ў афіцыйным блогу кампаніі. Ідэя падабаецца не ўсім карыстальнікам: некаторыя лічаць, што кампанія добраахвотна адмаўляецца ад прыкметы, якая вылучала яе сярод іншых сацсетак. У кампаніі лічаць інакш: там адзначаюць, што многія карыстальнікі адчуваюць нязручнасці ў сувязі з наяўнасцю ліміту ў 140 знакаў. Гэтае новаўвядзенне не будзе распаўсюджвацца на японскую, кітайскую і карэйскую мовы, паколькі яны дазваляюць выказацца з дапамогай меншай колькасці знакаў. Цяпер адпаведная функцыя даступная для тэсціравання невялікай групе карыстальнікаў. Калі могуць уступіць у сілу змяненні для ўсёй аўдыторыі сацыяльнай сеткі, пакуль не ўдакладняецца.

■ Адкрытая Беларусь

# «ВЯЛІКІ КРОК ЗРОБЛЕНЫ, АЛЕ ЁСЦЬ ДА ЧАГО ІМКНУЦЦА»

### Лічыць першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў

**У Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа» адкрылася міжнародная турыстычная выстаўка «Турбізнес-2017». Яна праходзіць у Мінску 24-ы раз, тэматыка экспазіцыі — уязны і выязны, спартыўны і прыгодніцкі, рэкрэацыйны, медыцынскі, сямейны і дзіцячы, паляўнічы турызм. На выстаўцы прадстаўлены тураператары і турагенты, транспартныя кампаніі, дэманструецца спартыўнае і турысцкае адзенне, рыштунак і абсталяванне, картаграфічная і сувенірная прадукцыя. Акрамя таго, праграма прадугледжвае прэзентацыі, круглыя сталы, семінары па актуальных праблемах галіны.**

Учора на адкрыцці прысутнічаў **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ**. Ён адзначыў, што галіна ў сваім развіцці зрабіла значны крок наперад і за апошнія гады стала адной з тых у народнай гаспадарцы, што найбольш дынамічна развіваюцца. *«Мы ўжо можам шырока прэзентаваць Беларусь нашым гасцям. Ім ёсць дзе атрымаць якасныя паслугі і ёсць што паглядзець. Каб прыцягнуць у краіну яшчэ большую колькасць замежных турыстаў, трэба вырашыць блок пытанняў. Гэта далейшая лібералізацыя візавага рэжыму, павышэнне ўзроўню сэрвісу. Тут ёсць куды імкнуцца і гасцініцам у плане абслугоўвання кліентаў, і рэстаранам у плане афармлення меню на замежных мовах, персаналу, які павінен валодаць імі».*

Максім Рыжанкоў таксама адзначыў, што неабходна павялічыць колькасць інтэрнэт-рэсурсаў па аказанні турыстам усяго комплексу паслуг — ад пражывання да экскурсій.

**Намеснік міністра спорту і турызму Міхаіл ПАРТНОЙ** падкрэсліў, што ў Беларусі назіраецца станоўчая дынаміка па ўсіх відах турыстычнай дзейнасці. Удасканальваецца заканадаўчая база ў гэтай сферы, ствараюцца спрыяльныя ўмовы для вядзення турыстычнага бізнесу, праводзяцца маркетынгавыя мерапрыемствы. Краіна становіцца ўсё больш адкрытай для замежных турыстаў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Прамая лінія

# А ШТО КАЖА ПРАЦОЎНАЕ ПРАВА?

### Не працягваць кантракт толькі таму, што вы дасягнулі пенсійнага ўзросту, — нельга

**Што лічыцца зменай умоў працы і ці павінен работнік пры гэтым распісвацца ў дадатковым пагадненні? Як перайсці з кантрактнай формы найму на бестэрміновы працоўны дагавор? Які мінімальны тэрмін трэба адпрацаваць жанчыне да выхаду ў новы дэкрэт? Ці павінен работадаўца выплаціць выходную дапамогу пры скарачэнні пенсіянера? Ці можна пасля дасягнення дзіцем трох гадоў заставацца з ім дома, але захаваць за сабой працоўнае месца?**

**Гэтыя і іншыя пытанні ў вас была магчымасць задаць, патэлефанаваўшы ўчора на прамую лінію гасцям рэдакцыі «Звязды» — юрыстам, <u>галоўнаму прававаму інспектару працы Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларысе Васільеўне МАНЮК і галоўнаму прававаму інспектару працы Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Сафіі Васільеўне ГРЫШУЦІНАЙ</u>.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

*— Добры дзень! 8 верасня гэтага года настаўнік-пенсіянер, які працуе школьным вартаўніком, атрымаў апавяшчэнне ад дырэктара гэтай вясковай школы аб яго рашэнні спыніць працоўныя адносіны з вартаўніком-пенсіянерам у сувязі са сканчэннем тэрміну дзеяння кантракта 18 кастрычніка 2017 года. Настаўнік-пенсіянер хоча — і здароўе дазваляе — і далей працаваць у гэтай школе. Наколькі гэта магчыма і як дамагчыся згоды дырэктара, каб ён не звальняў вартаўніка толькі таму, што той з'яўляецца пенсіянерам?* (Ліст дасланы па электроннай пошце.)

**На пытанне нашага чытача адказвае галоўны прававы інспектар працы Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК:**

— Вы, напэўна, ведаеце, што ў адпаведнасці з нашым заканадаўствам нельга звольніць работніка, кіруючыся тым, што ён дасягнуў пенсійнага ўзросту. Працэдура і падставы звальнення работнікаў, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, — такія ж, як і для іншых катэгорый работнікаў.

Таксама хачу сказаць, што ў адпаведнасці з галіновымі пагадненнямі паміж Міністэрствам адукацыі і Беларускім прафсаюзам работнікаў адукацыі і навукі на 2016—2019 гады, з работнікамі, якія паспяхова і добрасумленна выконваюць службовыя абавязкі і не маюць дысцыплінарных спагнанняў на працягу года, што папярэднічае даце заканчэння кантракта, і якія маюць працяглы стаж работы па спецыяльнасці (у галіне), працягласць якога вызначаецца ў кожнай канкрэтнай арганізацыі самастойна ў калектыўным дагаворы, кантракты заключаюцца на тэрмін ад 3 да 5 гадоў (падпункт 31.13 пункта 31).

На тэрмін не менш як 5 гадоў кантракты заключаюцца з работнікамі галіны, якія паспяхова і добрасумленна выконваюць службовыя абавязкі і не маюць дысцыплінарных спагнанняў на працягу года, што папярэднічае даце заканчэння кантракта, і якія маюць высокі прафесійны ўзровень і кваліфікацыю (падпункт 31.14 пункта 31).

Кантракты працягваюцца з работнікамі, якія паспяхова і добрасумленна выконваюць службовыя абавязкі і не маюць дысцыплінарных спагнанняў на працягу года, што папярэднічае даце заканчэння кантракта, у межах максімальнага тэрміну дзеяння кантракта з іх згоды (падпункт 31.15 пункта 31).

Таму вы маеце права звярнуцца да наймальніка з пісьмовай заявай, каб наймальнік у пісьмовым выглядзе растлумачыў прычыну (прычыны) непрацягнення (незаключэння новага) кантракта з вамі (падпункт 31.20 пункта 31).

Але хачу звярнуць вашу ўвагу: гэтыя гарантыі дзейнічаюць толькі ў дачыненні да тых работнікаў, якія не парушалі працоўную дысцыпліну і не маюць дысцыплінарных спагнанняў.

Калі наймальнік па патрабаванні галіновага прафсаюза не працягне з вамі кантракт (ці не заключыць новы), то ў адпаведнасці са Статутам галіновага прафсаюза (падпункты 18.1, 18.2 пункта 18), галіновых пагадненняў (падпункт 26.3 пункта 26) вы маеце права звярнуцца ў раённую, гарадскую, абласную арганізацыю ці ў Цэнтральны камітэт галіновага прафсаюза па абарону сваіх працоўных правоў, і вам будзе аказана бясплатная прававая дапамога. Адрасы і тэлефоны гэтых структур знаходзяцца на прафсаюзным стэндзе ўстановы адукацыі.

Калі наймальнік па патрабаванні галіновага прафсаюза не працягне з вамі кантракт (не заключыць новы), то галіновы прафсаюз з вашай згоды падрыхтуе іскавую заяву і будзе прадстаўляць вашы інтарэсы ў судзе.

***(Працяг прамой лініі чытайце ў наступных нумарах «Звязды».)***

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■

# Стаўка рэфінансавання — 11% з 18 кастрычніка

**Ужо восьмы раз сёлета ў Нацыянальным банку знізяць стаўку рэфінансавання. Так, з 18 кастрычніка яна паменшыцца з 11,5% да 11% гадавых. Як адзначылі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка, рашэнне было прынята па выніках штоквартальнага пасяджэння па пытаннях ацэнкі і прагнозу сітуацыі ў эканоміцы і грашова-крэдытнай сферы, якое адбылося 27 верасня.**

Па даных Нацбанка, інфляцыйныя працэсы працягваюць запавольвацца. Сёлета ў жніўні ў гадавым вымярэнні прырост спажывецкіх цэн знізіўся да 5,3%. Асноўны ўклад у запавольненне гадавых тэмпаў росту спажывецкіх цэн уносяць тавары, не схільныя да сезоннага ўплыву і адміністрацыйнага рэгулявання. З улікам фактычнай дынамікі інфляцыі чакаецца, што прырост спажывецкіх цэн будзе, паводле вынікаў 2017 года, ніжэйшы, чым прагназавалася раней, — бліжэй да 6%.

Таксама па-ранейшаму не прасочваецца значных рызык узмацнення ў сярэднетэрміновай перспектыве інфляцыйнага ціску з боку плацежнага балансу. Далейшыя рашэнні па змяненні працэнтных ставак Нацыянальнага банка будуць вызначацца імавернасцю і велічынёй рэалізацыі інфляцыйных рызык, якія стрымліваюць дасягненне сярэднетэрміновай мэты па інфляцыі — не больш за 5% у 2020 годзе.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■

■ Ёсць нагода

# РАЗМОВЫ ПРА СКАРЫНУ

**Весці іх з гледачамі будзе сацыякультурны тэлеканал «Беларусь 3» у новым праекце — мастацка-публіцыстычным фільме «Скарына. Дзеля Бога і людзей», прысвечаным 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Праект стартуе ў эфіры ўжо сёння ўвечары.**



«Кожны беларус ведае імя першадрукара, але гэтым, як правіла, і абмяжоўваюцца веды пра Францыска Скарыну», — гавораць стваральнікі фільма. І абяцаюць з дапамогай архіўных звестак, разваг гісторыкаў і літаратуразнаўцаў, а таксама акцёрскіх пастановачных сцэн наглядна паказаць, у чым заключаўся подзвіг полацкага асветніка, гуманіста, доктара медыцыны, першага на ўсходнеславянскіх землях перакладчыка Бібліі, і чаму ён сам быў «нязручны» для грамадства XVI стагоддзя.

Своеасаблівым правадніком паміж эпохамі ў чатырохсерыйным фільме выступіў заслужаны артыст Беларусі, старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька, які не толькі агучвае малавядомыя гістарычныя факты, але і часам уступае ў дыялог з персанажамі, прапануючы шаноўнай публіцы пафантазіраваць: як мог бы выглядаць Скарына ў наш час і кім бы ён стаў у XXI стагоддзі — «айцішнікам» ці, можа, прадпрымальнікам?

**Вікторыя ЗАХАРАВА.** *zaharava@zviazda.by*

# 500 КІЛАМЕТРАЎ БЕГУ ЗА 5 ДЗЁН

**Мінчанін Тарас Цялькоўскі вырашыў па-свойму ўшанаваць юбілей Бібліі Францыска Скарыны. Яго мэта — прабегчы 500 кіламетраў. Рабіць гэта ён плануе пяць дзён, штодзень — па 100 кіламетраў. Забег ужо пачаты.**


**Тарас разам з 5-гадовым Максімам, які разам з маці праехаў за ім апошнія 10 кіламетраў першага дня.**

З аўторка па суботу, кожны дзень, Тарас стартуе зранку ад электроннага табло каля Палаца спорту і бяжыць па веладарожцы ўздоўж Свіслачы. За гэты час ён некалькі разоў мінае раёны Драздзы, Чыжоўку і фінішуе зноў ля Палаца спорту. Дарэчы, ахвотныя могуць падтрымаць бегуна на любым участку дыстанцыі — прабегчы ці праехаць на веласіпедзе пэўную колькасць кіламетраў разам з ім — ці проста сустрэць на фінішы або старце.

Тарас займаецца бегам амаль 20 гадоў (цяпер яму 29). Ён быў членам юніёрскай зборнай Беларусі па лёгкай атлетыцы і выступаў на сярэдніх дыстанцыях — 1,5 і 5 км. Цялькоўскі пяць разоў удзельнічаў у паўмарафонах. Дарэчы, на апошнім Мінскім прыйшоў на фініш шостым сярод тых, хто бег «пяцёрку». Максімальная дыстанцыя, якая пакаралася бегуну, — марафон у Пецярбургу (42 км — за 2 гадзіны 37 хвілін). Мае ён і досыць экстрэмальны вопыт скарэння яшчэ большай дыстанцыі. Пару гадоў таму Тарас праехаў на веласіпедзе з аднаго канца Англіі ў іншы. Дыстанцыя склала 600 кіламетраў, і пераадолець яе хлопцу ўдалося за 25 гадзін.

Тарас Цялькоўскі да таго ж з'яўляецца пастарам пратэстанцкай царквы. Ён марыць, каб Біблія зноў стала кнігай нумар адзін для беларусаў, як і ў часы першадрукара. Таму ён і прысвяціў свой забег знакаваму юбілею і выбраў цалкам сімвалічную дыстанцыю — 500 кіламетраў.

— 500 гадоў таму Францыск Скарына надрукаваў першую Біблію на беларускай мове, — адзначае Тарас Цялькоўскі. — Гэта кніга ўдыхнула жыццё ў беларускае грамадства. Праз 500 гадоў яна працягвае мяняць жыцці мільёнаў людзей. Мая мэта — вярнуць Біблію ў рукі беларусаў. Я бягу пяць дзён па 100 кіламетраў, гэта 500 кіламетраў шляху, каб сказаць, што Біблія па-ранейшаму кніга нумар адзін.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■

# Зваротны адлік

### БРСМ пачаў прымаць заяўкі ад кандыдатаў у валанцёры II Еўрапейскіх гульняў

Старт кампаніі дадзены на маладзёжным форуме «ДаброFest». Падаць анкеты маладыя людзі могуць як у друкаваным, так і ў электронным выглядзе на сайце гарадской арганізацыі ГА «БРСМ». Адбор кандыдатаў будзе праводзіцца на працягу гэтага навучальнага года, для іх арганізуюць навучальныя заняткі па розных напрамках спартыўнага валанцёрства. Як адзначылі ва ўпраўленні спорту і турызму Мінгарвыканкама, у правядзенні II Еўрапейскіх гульняў будуць задзейнічаны 11 спартыўных аб'ектаў сталіцы, плануецца прыцягнуць каля 6 тысяч валанцёраў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

Ідэя+

Сумесны праект «Звязды» з камітэтам эканомікі Магілёўскага аблвыканкама

# СПРАВА ДЛЯ «АСАБЛІВЫХ» ЛЮДЗЕЙ

**Магіляўчанка Алеся ЦУМАРАВА вечны рухавік не прыдумала, але яе праект «Тэрыторыя людзей» можна смела называць наватарскім. На конкурсе прадпрымальніцкіх ідэй ён быў прызнаны лепшым сацыяльным праектам. Яго мэта — даць людзям з абмежаванымі магчымасцямі шанц зарабіць сабе на жыццё і адначасова прынесці карысць грамадству.**



Бізнес-школа ІПМ навучыла прасоўваць свае ідэі ў жыццё.

## Нік Вуйчыч натхніў

— За мяжой існуе цэлая сетка крамаў, якія спецыялізуюцца на продажы сувеніраў, зробленых выключна рукамі інвалідаў, — кажа Алеся. — Я збіраюся адкрыць такую гандлёвую кропку ў Магілёве, а потым, калі атрымаецца, яшчэ некалькі па краіне. Гэтая крама стане своеасаблівым клубам па інтарэсах, дзе кожны інвалід зможа навучыцца нешта рабіць сваімі рукамі, а потым гэта рэалізаваць.

Яна па сабе ведае, што значыць быць інвалідам. Лёс яе не шкадаваў. Каб навучыцца хадзіць, Алеся перанесла 14 аперацый, рана страціла маці, перажыла развод з любым чалавекам. Але не здавалася, ішла наперад і не ныла. У 35 гадоў пачала жыццё з новага ліста — зноў выйшла замуж і адкрыла сваю справу. Яна спадзяецца: яе прыклад натхніць тых, хто яшчэ працягвае думаць, нібыта ён ні на што не варты.

— Усё залежыць ад таго, як ты сябе падаеш. Адна жанчына ідзе, як каралева, і ўсе яе так і ўспрымаюць, а другая камплексуе, хвалюецца, чым толькі адштурхоўвае іншых ад сябе. На працягу 35 гадоў толькі і рабіла, што саромелася сябе, мне было нёмка паказваць сваё пасведчанне ў аўтобусе. А потым трапіла на выступленне Ніка Вуйчыча і цалкам перагледзела сваё стаўленне да жыцця. У ім усё было нашмат горш, чым у гэтага аўстралійца. Яму пашчасціла нарадзіцца ў краіне, дзе жывуць людзі з іншым менталітэтам. Гэта ў нас доўгі час інваліды выхоўваліся асобна ад астатніх і жылі ў спецустановах. Я ў дзяцінстве праз гэта таксама прайшла. Мне раптам стала так сорамна за сябе, што, калі вярнулася дадому, перш-наперш перапісала на сайце знаёмстваў сваю анкету. Раней выдавала сябе за лепшую, чым ёсць, але потым толькі пакутавала ад гэтага. Пры знаёмстве ўсё адразу ж ставалася зразумела. Пасля першай сустрэчы рэдка хто прыходзіў да мяне зноў. Была ўпэўнена, што ў жыцці застануся адна. Але праз два тыдні пасля таго, як размясціла ў сеціве новую анкету, пазнаёмілася са сваім цяперашнім мужам. Пры першай сустрэчы адразу аб'явіла яму, што ў мяне ДЦП і расказала ўсё, пра што раней лічыла патрэбным маўчаць. Унутрана была гатовая да таго, што чалавек адвернецца. Але ён застаўся.

## Найлепшы сацыяльны праект

Адкрыць сваю справу сёння нескладана, было б жаданне. Інтэрнэт у гэтым толькі дапамога. Галоўнае — выбраць, чым збіраешся займацца. Спачатку Алеся хацела зрабіць нешта выключна для сябе, але потым рызыкнула стаць карысной і для іншых. І ў гэтым ёй вельмі дапамагла бізнес-школа ІПМ, куды яна звярнулася, каб паўдзельнічаць у конкурсе прадпрымальніцкіх ідэй.

— Вельмі задаволена, што трапіла туды, хоць першым часам вельмі сумнявалася, што мяне там чамусьці новаму навучаць, — расказвае Алеся. — Аднак памылілася. Там даведалася і як бізнес-план скласці, і як потым прасоўваць сваю справу. Можна сказаць, што атрымала новую спецыяльнасць.

Яе праект быў прызнаны найлепшым спачатку на абласным, а потым і рэспубліканскім узроўні. Маладая жанчына адчувала сябе на сёмым небе ад шчасця за сябе і за тых «асаблівых» людзей, якім зможа дапамагчы.

— Шмат хто з іх займаецца рукадзеллем, але большасць гэтых работ выкарыстоўваецца выключна ў якасці экспанатаў для выставак на Дзень інваліда, — перажывае яна. — Але 3 снежня праходзіць, і пра іх забываюць. Сувеніры адпраўляюцца на палічкі, замест таго каб прыносіць людзям карысць. А для інваліда гэта нялішнія грошы. Я, нягледзячы на сваю асаблівасці, таксама хачу рабіць сабе манікюр, прычоску, купляць касметыку і моднае адзенне. На дапамогу па інваліднасці не вельмі можна разагнацца. Калі ў чалавека з'явіцца магчымасць зарабляць сабе на жыццё, ён не будзе хадзіць з працягнутай рукой і прасіць — дапамажыце.


Лялькі-абярэгі, напоўненыя духмянымі травамі.

## Калі адкрыецца крама?

На жаль, рэалізаваць праект аказалася больш складана, чым распрацаваць яго. Памяшканне пад будучую краму выдзелена, але не хапае грошай, каб яго адрамантаваць. Калі пафарбаваць сцены і столь можна самому, то ўваходную групу і санвузел без спецыяліста не зрабіць. Патрэбна не адна тысяча долараў, але такіх грошай у Алесі няма.

— Калі ўдзельнічала ў конкурсе прадпрымальніцкіх ідэй, імкнулася перамагчы, каб атрымаць грошы для развіцця свайго праекта, — кажа яна. — Але гэтыя сродкі аказаліся мэтавыя — для далейшага навучання ў бізнес-школе ІПМ. Не прапускаю магчымасці паўдзельнічаць у іншых конкурсах, брала ўдзел нават у сацыяльна-адукацыйным праекце «Мой бізнес» на АНТ, але пакуль не пашчасціла.

Звярталася да мэра Магілёва Уладзіміра Цумарава па дапамогу, пісала лісты ў розныя арганізацыі і прадпрыемствы з просьбай аказаць садзейнічанне, але ніякіх зрухаў. У сацыяльных сетках у мяне сотні падпісчыкаў, я ім таксама расказваю пра свае праблемы. Можа, хто адгукнецца. Праект сацыяльны, я на ім грошы не зараблю, тут без дапамогі іншых не абысціся.

Галоўны, хто падтрымлівае Алесю ў яе пачынаннях, гэта муж. Ездзіць з ёй на выставы рамеснікаў, шукае спонсараў. Нядаўна сужэнцы пачалі супрацоўнічаць з магілёўскай мэблевай фірмай IMebel, нават зладзілі сумесную акцыю. Кожны пакупнік мэблі атрымаў сувенір ад «Залатой стужкі». Такую назву Алеся прыдумала для сваёй крамы. Ёсць спробы супрацоўніцтва з прадпрыемствам «Беларуснафта». Распрацаваны буклет з Алесіным айбанам і распаўсюджаны па бензакалонках.

Каб цалкам прысвяціць сябе справе, Алеся звольнілася з бібліятэкі і вядзе гурток рукадзелля для людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў Ленінскага раёна. Трэба вучыць людзей карыснай справе, каб яны атрымалі магчымасць працаваць. Тым часам колькасць ахвотных рэалізаваць свой хэнд мэйд праз Алесіну краму становіцца ўсё больш. Далучаюцца ўмельцы з Мінскай, Брэсцкай абласцей.

— Паглядзіце на фота, гэта ўсё канкурэнтаздольныя тавары, не скажаш, што іх зрабіў інвалід, — перажывае за сваё дзецішча Алеся. — Іх прыемна будзе падарыць любому чалавеку. Бачыце, якая арыгінальная ручка. А вось шкатулка ў выглядзе лялькі. Мы можам рабіць сувеніры пад заказ да любога свята.

Пакуль Алеся вымушана захоўваць усё гэта багацце ў сваёй кватэры і рэалізоўваць цераз інтэрнэт-краму. Яна нават думкі не дапускае, што праект можа спыніцца. Тое, што ён жывы, можна ўпэўніцца, завітаўшы на сайт gold-ribbon.reshop.by. Даходы пакуль невялікія, але Алеся не здаецца.

— У Магілёве 18 тысяч інвалідаў, у вобласці — 54 тысячы, у краіне — 840 тысяч. І шмат хто з іх можа прыносіць радзіме карысць, — аргументуе яна. — У мяне адказнасць перад людзьмі, якія чакаюць гэтай крамы. Я не магу ім проста сказаць: прабачце, нічога не атрымалася. Калі Нік Вуйчыч змог, мы таксама зможам. Усе вакол гавораць пра дармаедства, але гэта той выпадак, калі людзі жадаюць працаваць. Нельга іх пазбаўляць надзеі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

***P.S.** Вы таксама можаце далучыцца да добрай справы і падтрымаць Алесін праект. Вось яе рэквізіты:*

IBAN BY20ALFA30132231730040270000
СВИФТ-ALFABY2X

**Фота з архіва Алесі ЦУМАРАВАЙ.**

■ Ураджай

# ВЕРАСНЁЎСКІ ДРУГІ ХЛЕБ

### Бульбы, як і іншай агароднiны, сёлета хопіць усім

**Любімыя многімі беларусамі караняплоды на палетках Гомельскай вобласці на сённяшнюю дату ўбраны на 44%. Бульбы накапалі 63,2 тысячы тон пры ўраджайнасці 262 цэнтнера з гектара.**

— Ураджайнасць на 33% вышэйшая за ўзровень мінулага года. І хоць плошчы пад бульбу на Гомельшчыне скарочаны на 11%, без любімых клубняў беларусы не застануцца, — гаворыць **намеснік старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Іван СІДАРЭНКА.** — Сёння бульбай займаюцца спецыялізаваныя гаспадаркі, якія маюць сховішчы для якаснага захоўвання ўраджаю. Калі гэтай культурай займацца сур'ёзна і думаць пра яе экспарт, то важна выконваць умовы захоўвання — толькі ў спецыяльных памяшканнях, для гэтага прызначаных.

Самая высокая ўраджайнасць бульбы — у Буда-Кашалёўскім раёне — 350 ц/га. Амаль 300 цэнтнераў атрымліваюць з гектара ў Рагачоўскім і Гомельскім раёнах. У аблсельгасхарчы падкрэсліваюць, што насельніцтва вобласці будзе забяспечана бульбай у неабходнай колькасці. Зрабіць запасы можна падчас восеньскіх кірмашоў па продажы сельскагаспадарчай прадукцыі, якія праходзяць да канца восені. Самая важная задача, якой займаюцца аграрыі, гэта фарміраванне стабілізацыйных фондаў. Запэўніваюць, што ўсім хопіць не толькі бульбы, але і іншай агародніны.

— Нашы асноўныя культуры — бульба, капуста, цыбуля, морква, буракі — будуць закладзены на ўзроўні мінулага года. Капусту пакуль убіралі толькі ранняспелую. Што датычыцца позняй — тэрміны ўборкі не зусім падышлі. Буракі ўбраны на Гомельшчыне на 8% плошчаў, накапана 727 тон. Іх ураджайнасць перавышае ўзровень мінулага года амаль у два разы і складае 560 ц/га. Морква ўбрана на пятай частцы плошчаў, яе накапалі амаль 2 тысячы тон. Ураджайнасць гэтай культуры на ўзроўні мінулага года — 480 ц/га. Значна перавысілі леташні ўзровень па цыбулі. Яе ўжо сабралі 18,5 тысячы тон. На палях засталося менш за 8% — гэта дзесьці 40 га. Некалькі гадоў у Жыткавіцкім раёне вырошчваюць салодкую кукурузу. Сёлета сабралі 1000 тон катахоў, — паведамляе абласны камітэт.

Што датычыцца кукурузы, якую гаспадаркі вырошчваюць на зерне, яна можа стаяць на палях даволі доўга. Пры гэтым якасць яе не пагаршаецца. Наваг наадварот, запэўнівае Іван Сідарэнка:

— Памяншаецца яе вільготнасць і, значыць, патрабуецца менш выдаткаў пры сушцы. Мы будзем імкнуцца на працягу кастрычніка ўбраць кукурузу, прызначаную на зерне. Сёння ўбрана 4,7 тысячы га, намалочана 30,7 тысячы тон. Ураджайнасць цяпер 66 ц/га, але яна павялічыцца.

Такім чынам, сцвярджаюць у камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама, агародніны для ўнутранага рынку хопіць. А што застанецца, гаспадаркі будуць прадаваць на экспарт.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*


Фота БЕЛТА.

# Рэкардсмен па ўраджайнасці

**У Віцебскай вобласці не першы год рэкордны ўраджай «другога хлеба». На поўначы краіны ўраджайнасць бульбы пад 400 цэнтнераў. А ў Талачынскім раёне яшчэ большая: каля 420 цэнтнераў — на палях, за якія адказвае мясцовы кансервавы завод. Для параўнання, аналагічны сярэдні паказчык па краіне на ўзроўні каля 330 ц/га.**

Паводле інфармацыі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама, для бульбы было адведзена каля 2,5 тысячы гектараў. Каб добра захаваць сабранае, у сховішчах, а іх у вобласці 55, правялі рамонт, дэзынфекцыю і іншыя мерапрыемствы. У іх будзе закладзена таксама садавіна і гародніна — па вазе на леташнім узроўні.

На палях вобласці на 66,2 тысячы гектараў вырасла кукуруза. Сёлета яе ўраджайнасць на ўзроўні 240 ц/га.

У апошнія дні надвор'е спрыяла аграрыям. І на бягучым тыдні сiноптыкі на момант падрыхтоўкі публікацыі дажджы не прагназавалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
28 ВЕРАСНЯ 2017 г.
ЧАЦВЕР
№18 (15825)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# Вольга ЕРМАЛІЦКАЯ: «Хачу быць найлепшай ва ўсім»



**Дзяўчына ніколі не марыла быць спартсменкай, тым больш чэмпіёнкай свету. Яна не займалася спортам да паступлення ў вышэйшую навучальную ўстанову, але выпадковая сустрэча з трэнерам па паўэрліфтынгу ў літаральным сэнсе змяніла яе жыццё. Спачатку дзяўчына стала самай моцнай у краіне, а потым і ў свеце. Разам з тым Вольга ЕРМАЛІЦКАЯ цалкам абвяргае стэрэатып аб «сціплых» разумовых здольнасцях спартсменаў: яна вучыцца ў Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі, яе сярэдні бал — 10. Як удалося сумяшчаць спорт з навуковай дзейнасцю і стаць чэмпіёнкай свету за тры гады, Вольга расказала ў сваім інтэрв'ю.**

***— Залатым медаль нядаўняга чэмпіянату свету па паўэрліфтынгу вы выйгралі, падняўшы ў агульнай суме 267,5 кілаграма...***

— Так, выступленне ў нас складаецца з трох практыкаванняў — прысяданне са штангай, жым лежачы і станавая цяга. У першым прысядала са штангай 92,5 кілаграма, але сіл хапала і на большую вагу, у другім выжымала 57,5 кілаграма, у трэцім — 117,5 кілаграма. Усюды ў мяне быў найлепшы вынік і, адпаведна, залаты медаль чэмпіянату свету.

***— Ці чакалі такога ад сябе?***

— Тры гады я выступала ў вагавой катэгорыі 47 кілаграмаў і была самай лёгкай сярод саперніц, гэта не вельмі выгадна, таму перад чэмпіянатам свету 2017 вырашыла скінуць вагу і выступіць у катэгорыі 43 кілаграмы. Разам з трэнерам нават не ўяўлялі, як пакажу сябе на гэтым турніры ў новай форме. Вельмі хвалявалася. Дзесьці ў глыбіні душы разлічвала трапіць у тройку, але пра тое, што буду першай, і не марыла.

***— Якія эмоцыі адчулі на п'едэстале?***

— Зрабіла апошні падыход, і проста з памоста мяне забралі на допінг-кантроль, таму я нават не бачыла, на якім месцы знаходжуся. Калі вярнулася, а трэнер сказаў, што я першая, не магла ў гэта паверыць. Шок. Ужо мінула трохі часу, а я ўсё роўна думаю, няўжо гэта сапраўды было, няўжо я гэтага дамаглася...

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Педсавет

# «МАЗГАВЫ ШТУРМ» — НА «ДЗЯСЯТАЧКУ»

## Ці можа настаўнік зацікавіць вучня сваім прадметам?

**«Не люблю матэматыку!», «Не разумею фізіку!», «Ну навошта мне вашы біялогія і хімія?» Колькі школьнікаў штодня скардзяцца, што іх прымушаюць вучыць тое, што ім нецікава, непатрэбна і незразумела. А потым шакіруюць экзаменатараў сваімі «бліскучымі ведамі», калі не могуць справіцца з элементарнымі задачкамі і пытаннямі. Як можна вымераць і павысіць матывацыю да вывучэння прыродазнаўчых навук? Гэтым пытаннем задалася беларуская каманда Brainstorm («Мазгавы штурм») — адна з удзельніц міжнароднай анлайн-праграмы PISA4U. У яе склад увайшлі супрацоўнікі ўпраўлення маніторынгу якасці адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Алена БЯЛЬНІЦКАЯ, Ігар СВІРШЧЭЎСКІ, Валянціна МАЛІНОЎСКАЯ і Андрэй НАЗАРЧУК. Мы сустрэліся з педагогамі, каб даведацца пра створаны імі адукацыйны рэсурс, які атрымаў высокую ацэнку міжнароднай педагагічнай супольнасці і перамог у намінацыі PISA4U Community Award.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Ад настаўніка залежыць многае.

Пазнаёміцца з прафесіяй

# «ЗА ТЫДЗЕНЬ БЫВАЕ 50 АПЕРАЦЫЙ»

## Малады хірург — пра асаблівасці сваёй работы

**На першых курсах медуніверсіта большасць студэнтаў хоча стаць хірургамі. Але рамантыка хутка разбіваецца аб рэальнасць. Калі пачынаюцца спецыялізаваныя прадметы і практыка за аперацыйным сталом, многія перадумваюць. Яўген КРУЧОНАК не з іх ліку. Трэці год хлопец працуе рэнтгенаэндаваскулярным хірургам у 9-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска. Сёлета ён стаў найлепшым сталічным маладым спецыялістам у галіне аховы здароўя. Навошта надзяваць спадніцу падчас аперацыі і як музыка ратуе ад стомы, мы даведаліся з першых вуснаў.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### «МЕДЫКІ ПАТРЭБНЫ ЗАЎСЁДЫ»

У бальніцу Яўген трапіў па размеркаванні. Паўгода працаваў агульным хірургам у прыёмным аддзяленні, а потым атрымаў цяперашнюю спецыялізацыю. Хлопец праводзіць аперацыі ўнутры сасудаў. Расказвае, што рэнтгенаэндаваскулярная хірургія — дастаткова новая галіна медыцыны. Раней, калі парушаўся крываток, неабходна было «ўшываць» новы сасуд: рабіць разрэз на ўсе грудзі, спыняць сэрца. Цяпер жа можна «адрамантаваць» стары. Для гэтага дастаткова праколу ў сасудзе, праз які ўстановяць стэнд (гэта металічная канструкцыя, якая, як каркас, падтрымлівае сценкі сасуда і паляпшае яго праходнасць).

За тыдзень у Яўгена звычайна бывае пад 50 аперацый. Колькі часу зойме адна, залежыць ад складанасці: дыягностыка доўжыцца 40—60 хвілін, лячэнне — мінімум паўтары гадзіны.

— Пакуль працуеш, стомленасці не адчуваеш, — тлумачыць малады ўрач, калі бачыць, наша здзіўленне. — Вось калі выканаў апошнюю аперацыю і прысеў у ардынатарскай папіць кавы, тады разумееш, што сіл няма. Я ўжо прывык да гэтага рытму.

Пра цяжкасці прафесіі хлопец ведаў не па чутках: яго мама працуе загадчыцай неўралагічнага аддзялення ў той жа бальніцы. Праўда, з дзяцінства стаць доктарам Яўген не марыў. Успамінае, што ў садку хацеў пайсці ў настаўнікі матэматыкі — як тата, які выкладае на факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ. А ў старшых класах вагаўся: паступаць на юрфак ці ў медыцынскі (у сям'і Яўгена прыкладна пароўну медыкаў і прававедаў).

— Ціску з боку сям'і не адчуваў. Абмяркоўваліся перспектывы: калі я паступаў, юрыстаў выпускалася вельмі шмат, а вакансій для іх не было. А медыкі заўсёды патрэбны.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

# «МАЗГАВЫ ШТУРМ» — НА «ДЗЯСЯТАЧКУ»

## Праблема нумар адзін

PISA4U — анлайн-праграма, скіраваная на паляпшэнне якасці адукацыі і работы школы. Стаць часткай міжнароднай супольнасці прафесіяналаў і вучыцца ў экспертаў у галіне адукацыі мог любы педагог. Але галоўнай умовай было агучыць актуальную для сістэмы адукацыі праблему, а потым прапанаваць шляхі яе вырашэння. Фактычна гэта быў конкурс адукацыйных праектаў, які адначасова даваў удзельнікам доступ да інавацыйных адукацыйных рэсурсаў, самай сучаснай літаратуры, відэавыступленняў ментараў, відэаўрокаў і стасункаў з калегамі з іншых краін.

Першапачаткова на сайце праграмы зарэгістравалася каля чатырох тысяч чалавек, з якіх арганізатарамі было створана 800 міжнародных камандаў, але да фінішу праз усе шэсць этапаў дайшло з іх толькі крыху больш як 100. А Brainstorm у фінале ўвайшла ў ТОП-5.



Каманда Brainstorm — Валянціна Маліноўская, Андрэй Назарчук, Алена Бяльніцкая, Ігар Свіршчэўскі: «Мы імкнуліся зрабіць універсальны для ўсіх рэсурс...»

**«Вучань цягне руку, каб адказаць, але настаўнік яго не выклікае адзін урок, другі, а потым у дзіцяці знікае інтарэс...»**

**Алена Бяльніцкая:** — У некаторых камандах удзельнікам з розных краін было даволі складана знайсці агульную мову з прычыны не заўсёды зразумелай нацыянальнай спецыфікі сістэм адукацыі і нават рознай тэрміналогіі, якая там ужываецца. Так сталася і ў нашым выпадку, бо першапачаткова каманда была інтэрнацыянальная — у яе ўключылі педагогаў з Бразіліі і Амерыкі. Затым з-за нізкай іх актыўнасці каманда засталася выключна беларускай. Нават нам спачатку было складана вызначыць кірунак праекта. Даводзілася арганізаваць сапраўдны мазгавы штурм (так, дарэчы, мы і назвалі ў выніку сваю каманду). Галоўным для нас было максімальна выкарыстаць магчымасці і практычны досвед кожнага члена. Я прадстаўляла прыродазнаўчыя навукі — хімію і біялогію. Валянціна Іванаўна — матэматыку. Ігар Юр'евіч і Андрэй Віктаравіч — інфармацыйныя тэхналогіі, плюс абодва яны маюць багаты досвед кіраўніцкай дзейнасці. Кожны з нас прапанаваў тры праблемы, а потым мы выбралі адну, якая звязвае нас усіх. Праблема павышэння матывацыі школьнікаў да вывучэння матэматыкі і прыродазнаўчых навук актуальная для усіх краін, што пацвярджаецца як міжнароднымі даследаваннямі адукацыйных дасягненняў вучняў, так і нашым рэспубліканскім маніторынгам ацэнкі якасці адукацыі.

**Валянціна Маліноўская:** — Матэматыка займае вядучае месца ў фарміраванні асноўных інтэлектуальных уменняў і асабістых якасцяў вучняў, неабходных для жыцця ў сучасным грамадстве, — гэта гімнастыка для розуму, якая фарміруе агульныя прыёмы мыслення, логіку, трэніруе памяць, знаёміць з асноўнымі матэматычнымі фактамі, вучыць пошуку шляхоў вырашэння праблем, а без усяго гэтага немагчыма паспяховае навучанне па многіх іншых прадметах, у тым ліку і вывучэнне фізікі.

**Алена Бяльніцкая:** — Нярэдка толькі ў старшых класах школьнікі канчаткова вызначаюцца са сваімі схільнасцямі да тых ці іншых навук, але што рабіць старшакласніку, які раптам зразумеў, што яму не хапае базавых ведаў, напрыклад, па фізіцы ці хіміі для атрымання запаветнай прафесіі? Адсутнасць у сучасных школьнікаў разумення значнасці матэматычных ведаў ці ведаў па прыродазнаўчых навуках — праблема нумар адзін. Гэта прызнаюць педагогі многіх краін. Магчыма, тым і тлумачыцца вялікая ўвага з боку замежных калег да распрацаванага намі рэсурсу.

## Унутраная і знешняя матывацыя

**Алена Бяльніцкая:** — Мэтай каманды было распрацаваць дыягнастычныя інструменты і метадычныя рэкамендацыі для настаўнікаў матэматыкі, прыродазнаўчых навук і школьных адміністратараў. Гэта, дарэчы, была адна з умоў арганізатараў праграмы: не проста паставіць праблему, але і прадумаць спосабы, як яе ацаніць, распрацаваць рэсурс, які можна будзе выкарыстоўваць у штодзённай школьнай практыцы. Між іншым, матывацыя можа быць як унутраная, так і знешняя. Калі школьнік атрымлівае задавальненне непасрэдна ад працэсу пазнавальнай дзейнасці, яму падабаецца рашаць задачы, чытаць дадатковую літаратуру па прадмеце, праводзіць эксперыменты, калі ён кіруецца жаданнем даведацца больш — мы маем справу з унутранай матывацыяй. Калі нам удасца сфарміраваць у вучня ўнутраную матывацыю яшчэ ў школе, гэта будзе гарантыяй таго, што і пасля выхаду ў дарослае жыццё схільнасць да самаадукацыі ў яго не знікне, ён будзе імкнуцца пастаянна развівацца і павышаць сваё прафесійнае майстэрства. Знешняя матывацыя (жаданне быць найлепшым у класе, пачуць пахвалу, атрымаць заахвочванне, быць карысным і г. д.) таксама можа быць эфектыўнай, але **як толькі знікаюць знешнія стымуляцыйныя фактары, інтарэс да вучобы тут жа знікае.** Напрыклад, вучань цягне руку, каб адказаць, але настаўнік яго не выклікае адзін урок, другі, а потым у дзіцяці знікае інтарэс...

Школьнікі з нізкім узроўнем матывацыі трапляюць у парадаксальную сітуацыю, калі веды ім патрэбныя ў жыцці, але яны не бачаць каштоўнасці гэтых ведаў і не могуць іх прымяніць. Як у школьным анекдоце, калі Вовачка піша запіску настаўніку, кладзе яе ў бутэльку і адпраўляе ў акіян: "Марыя Іванаўна, я знаходжуся на бязлюдным востраве. На працягу трох гадоў косінус мне так і не спатрэбіўся".

***— А якія фактары спрыяюць інтарэсу ў вывучэнні прыродазнаўчых навук? Цікавыя, напісаныя даступнай мовай, багата ілюстраваныя падручнікі могуць быць стымуляцыйным фактарам?***

**Алена Бяльніцкая:** — І падручнікі, і сучасныя сродкі навучання, тыя ж інфармацыйныя тэхналогіі, актыўныя метады і формы (работа ў камандзе, практыкаарыентаванае навучанне, якое звязана з асабістым досведам школьніка, вырашэнне праблемных сітуацый), эксперыменты, рэальныя і віртуальныя адукацыйныя экскурсіі і г. д.

**Валянціна Маліноўская:** — Вельмі моцны матывавальны фактар — гэта асоба настаўніка. А да фактараў, якія негатыўна ўплываюць на цікавасць да прадмета, трэба аднесці цяжкасці ў працэсе навучання, звязаныя з асабістымі характарыстыкамі, сямейнымі ўмовамі, дрэнныя адносіны з настаўнікам або іншымі вучнямі ў класе, слабую матэрыяльна-тэхнічную базу школы, якая не дае магчымасці рэалізаваць эксперыментальную частку вучэбнай праграмы, адсутнасць дысцыпліны, шум на ўроках.

**Андрэй Назарчук:** — Прымяненне ІТ дыверсіфікуе ўрок, дазваляе павялічыць яго шчыльнасць, актывізаваць работу вучняў, забяспечыць выкарыстанне дадатковых навучальных матэрыялаў у інтэрнэце. Увогуле выкарыстанне ІТ на ўроку дапамагае стварыць больш эфектыўную мадэль навучання, але толькі ў выпадку іх правільнага выкарыстання...



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Вучоба пачакае!
У нас ёсць больш цікавыя заняткі!

**Алена Бяльніцкая:** — Адным з самых складаных заданняў, якія мы атрымалі ад арганізатараў, аказалася прадэманстраваць на практыцы, як дзейнічае наш інструментарый. Мы літаральна ўскочылі ў апошні вагон і паспелі правесці апытанне ў апошнія дні навучальнага года на базе двух класаў. У цэнтры нашай увагі аказаліся 15-гадовыя падлеткі, гэта значыць, мэтавая аўдыторыя міжнароднага даследавання адукацыйных дасягненняў вучняў PISA, у якім мы будзем удзельнічаць у 2018 годзе.

Для ацэнкі матывацыі ўзялі методыку расійскіх вучоных (М. Лук'янавай і Н. Калінінай), але адаптавалі яе пад свае мэты. Дзякуй нашым мужчынам, якія прыдумалі, як спрасціць апрацоўку даных, таму што любыя анкеты па матывацыі, як правіла, даволі складаныя ў апрацоўцы, і настаўніку проста не хапае часу, каб гэтым займацца.

**Ігар Свіршчэўскі:** — Для правядзення апытання навучэнцаў мы стварылі анлайн-анкету ў інтэрнэце на аснове бясплатнай службы Google.com — forms.google.com. Гэта вельмі просты сэрвіс. Матывацыя ў анкеце ацэньваецца па адказах вучняў на васямнаццаць пытанняў па дзевяці параметрах. Праз інтэрнэт мы можам правесці апытанне любой колькасці вучняў і атрымаць іх адказы за кароткі час. Яны захоўваюцца ў табліцы на Google. Таксама намі створана спецыяльная табліца, куды капіруюцца вынікі анкетавання, а праграма аўтаматычна іх апрацоўвае і выдае вынік.

**Андрэй Назарчук:** — Наш рэсурс бясплатны і даступны ўсім.

***— І што паказала праведзенае вамі анкетаванне?***

**Алена Бяльніцкая:** — Атрыманыя звесткі выявілі сур'ёзную праблему — **толькі каля 27% школьнікаў канстатавалі высокую асабістую зацікаўленасць у навучанні. Сярэдні паказчык дэманструе кожны другі школьнік, а ніжэйшы за сярэдні — кожны пяты.** Між іншым, асабісты сэнс у навучанні — адзін з найважнейшых унутраных стымулаў для школьнікаў.

94% падлеткаў вывучаюць матэрыял сумленна, толькі калі ім гэта цікава. 44% — калі ў іх добры настрой. 32% — пры неабходнасці выправіць адзнаку, і толькі 27% заўсёды вучацца сумленна. Гэтыя адказы сведчаць пра недастатковыя намаганні ў вучобе з боку навучэнцаў, а толькі знешнія фактары не могуць даць чаканага эфекту.



Больш як 70 працэнтаў апытаных падлеткаў паведамілі, што ім падабаецца рабіць дамашнія заданні ў цішыні...

## Усё зусім не безнадзейна

***— Добры настрой вучня і насамрэч важны, але што гэта інфармацыя дае непасрэдна настаўніку?***

**Алена Бяльніцкая:** — Ведаючы сітуацыю, так бы мовіць, знутры, той можа паклапаціцца пра стварэнне ў класе станоўчай эмацыянальнай атмасферы. Можа параўнаць намаганні і вынікі работы вучня з яго папярэднімі намаганнямі і вынікамі, паказаць уласную зацікаўленасць у пазітыўнай дынаміцы яго адукацыйных дасягненняў.

Больш як 70 працэнтаў апытаных падлеткаў таксама паведамілі, што ім падабаецца рабіць дамашнія заданні ў цішыні, калі нічога не адцягвае іх увагу. Значыць, можна правесці гутарку з бацькамі школьнікаў, каб тыя паклапаціліся аб арганізацыі для дзіцяці дома рабочага месца.

**Больш як 67% навучэнцаў лічаць, што самае цікавае на ўроку — гэта новая тэма, навуковыя эксперыменты і рашэнне вылічальных задач. 32% зацікаўлены ў тым, каб слухаць тлумачэнні настаўніка.** Прыкладна столькі ж зацікаўлены ў тым, каб самім адказаць у вуснай форме, абмяркоўваючы праблемы ўслых.

**Валянціна Маліноўская:** — Увогуле веданне асаблівасцяў матывацыі да вывучэння матэматыкі і прыродазнаўчых навук дае настаўніку бясспрэчныя перавагі ў выбары формаў і метадаў навучання ў класе. Чым вышэйшы ўзровень матывацыі, тым шырэйшы і спектр урокаў. Для навучэнцаў з вельмі высокай і высокай матывацыяй мы раім праводзіць урокі-спаборніцтвы, урокі-эстафеты, урокі-лекцыі, урокі па вырашэнні ключавых праблем, урокі-кансультацыі. Пры рабоце з вучнямі з сярэдняй і слабай матывацыяй настаўніку трэба часцей выкарыстоўваць праблемныя сітуацыі з розным кантэкстам, звязаныя з іх асабістым досведам, ствараць станоўчы эмацыянальны фон у класе, адзначаць поспех кожнага вучня ў параўнанні з самім сабой. Важна атрымаць зваротную сувязь ад сям'і вучня, каб абмеркаваць з бацькамі пытанні выхавання волі, імкненне да поспеху, выкананне дамашняга задання (стварэнне ўмоў і г. д).

**Алена Бяльніцкая:** — Дыягностыка матывацыі школьнікаў — гэта інструмент для маніторынгу стану праблемы, які можа выкарыстоўвацца як настаўнікам, так і адміністрацыяй установы адукацыі — для адсочвання колькасці вучняў з розным узроўнем матывацыі ў навучанні (напрыклад, з моцным жаданнем дамагчыся поспеху ў вучобе і тых, якія імкнуцца пазбегнуць няўдач), адсочваць іх дынаміку, каб ствараць спрыяльныя ўмовы для развіцця ўнутранай матывацыі навучэнцаў у адукацыйным асяроддзі.

Мы прапануем настаўніку стварыць метадычную капілку і ўжо размясцілі на нашым рэсурсе некалькі карысных спасылак, напрыклад, па развіцці пазнавальнай актыўнасці вучняў праз сайт ці блог, які вядзе педагог...

***— Brainstorm у фінале ўвайшла ў ТОП-5. Наколькі вострай была канкурэнцыя?***

**Алена Бяльніцкая:** — Надзвычай вострай. Было шмат вельмі цікавых і актуальных праектаў. Не ўсе з іх можна прымяніць у нашай адукацыйнай практыцы, таму што, напрыклад, праблемы навучання дзяцей мігрантаў для нас неактуальныя. Шчыра кажучы, калі мы цалкам акунуліся ў гэты праект, нават не задумваліся пра перамогу. Гэта быў новы каласальны прафесійны досвед. Мы кантактавалі з калегамі з іншых краін, паралельна ўдасканальваючы і сваю англійскую мову. Абавязковай умовай было актыўнае ацэньванне іншых камандаў, прычым мы выстаўлялі не толькі адзнакі ў балах, але і давалі каментарыі. Такія ж балы выстаўлялі і нам. Перамога ў намінацыі PISA4U Community Award для нас вельмі каштоўная, таму што нас прызналі пераможцамі не члены журы (іх галасы схіліся ў бок іншых удзельнікаў), а прафесійная супольнасць. Гэта вялікі гонар, значыць, наша праца была недарэмнай.

**Ігар Свіршчэўскі:** — Мы імкнуліся зрабіць універсальны для ўсіх рэсурс, каб настаўнік у любой краіне мог ім скарыстацца. Ён знаходзіцца ў свабодным доступе. Таму вельмі спадзяёмся, што ён будзе карысны і беларускім педагогам. Адрас сайта — **https://sites.google.com/site/pisa4brainstormteam.** Там знаходзіцца таксама файлы і спасылкі на рускамоўны варыянты анкеты і матэрыялы для яе апрацоўкі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
nikalaeva@zviazda.by

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Ідэі маладых

# ДАПАМОГА Ў АДЗІН КЛІК

## Праграма, якая можа ратаваць жыцці

**Распрацоўкай айчыннымі праграмістамі мабільных праграм ужо не здзівіш нікога: спецыялістаў у гэтай сферы ведаюць не толькі ў Беларусі. Успомніць хоць бы Viber ці «Маскарад». Але калі «камунікатары» ды «забаўлялкі» папаўняюцца амаль штодня, то праграмы сацыяльнага кірунку нават цяжка адразу прыгадаць, ды і попытам яны карыстаюцца значна меншым. Толькі гэта не значыць, што падобныя праекты не развіваюцца. Сяргей КОСІК — беларускі праграміст, які сярод многіх кірункаў у сферы IT абраў менавіта «сацыялку». Пацвярджэнне таму — яго праграма #ButtonSOS. Пра матывацыю выбару і важнасць такіх распрацовак мы пагутарылі з Сяргеем і яшчэ адным аўтарам праекта Ягорам СКРАБНЕЎСКІМ.**

— Я яшчэ з дзяцінства пачаў цікавіцца тэхналогіямі, — расказвае Сяргей. — Сем гадоў працаваў інжынерам-праграмістам у розных кампаніях. Якраз тады захапіўся ўсім, што звязана з каардынатамі — мне падабаецца вандраваць. Пачаў праграмаваць на базе ўласных распрацовак. Першая версія праграмнага забеспячэння прызначалася зусім не для кнопкі SOS — першапачаткова гэта была ідэя фітнес-трэкера. У свеце існавала ўжо каля дзесяці такіх буйных праграм, але да іх часта прадаюць дадатковую прыладу, напрыклад, бранзалецік. Мая ж ідэя была ў тым, каб праграма працавала проста праз мабільны тэлефон.

На думку Сяргея, яго праграма была ўнікальнай, бо вылічвала тыя ж самыя калорыі, што і іншыя фітнес-трэкеры, але з выкарыстаннем толькі геаграфічных каардынат. Прадаваць алгарытм буйным фірмам Сяргей не хацеў, а чаго зразумеў: бяспека — гэта менавіта тое, што яго насамрэч цікавіць. Паступова да праграміста пачалі далучацца аднадумцы, з гэтага моманту каманда і пачала працэс распрацоўкі #ButtonSOS.



Стваральнік праграмы Сяргей Косік.

— Наша праграма створана для дапамогі ў экстраннай сітуацыі. Кнопка выведзена проста на экран блакіроўкі смартфона, — тлумачыць Ягор. — Пры яе націсканні праграма пачынае працэс рассылкі вашых геаграфічных каардынат і падрыхтаванага загадзя кароткага паведамлення з просьбай аб дапамозе. Спачатку тэлефон будзе вібраваць пяць секунд, таму ў карыстальніка ёсць магчымасць адмяніць рассылку пры выпадковым націсканні. Потым паведамленне дашлецца давераным асобам. Праз чатыры секунды інфармацыя будзе разаслана ўсім карыстальнікам праграмы, якія знаходзяцца ў радыусе кіламетра ад вас. Яшчэ праз тры секунды аўтаматычна запусціцца званок у экстранную службу 112. Рассылку паведамлення можна адмяніць на любым этапе і даслаць сігнал, напрыклад, толькі сваякам. Акрамя таго, распрацоўшчыкі сцвярджаюць, што прылада працуе і як GPS-трэкер. У выпадку, калі чалавек згубіўся, можна ўстанавіць яго месцазнаходжанне.

Сяргей звяртае ўвагу, што цяпер яго маленькая кампанія запускае краўдфандынг для дапрацоўкі Android-версіі. Распрацоўка для платформы iOS таксама плануецца, але чакаць гэтага можна толькі пасля таго, як праграмісты збяруць патрэбныя сродкі для дапрацоўкі #ButtonSOS для Android.

— Пакуль наш праект не мае фінансавання ад інвестараў і, па-сутнасці, з'яўляецца валанцёрскім, бо каманда робіць яго на ўласныя грошы. Краўдфандынгавая акцыя дапаможа падштурхнуць развіццё праграмы, — кажа Ягор.

Адрозненні яе ад іншых «дапаможнікаў» заўважаеш не адразу, але іх наяўнасць можа быць высока ацэнена карыстальнікам. Па-першае, гэта эканомны расход батарэі тэлефона ў параўнанні з іншымі праграмамі. Па-другое, значна вышэйшая дакладнасць вызначэння каардынат дзякуючы адсочванню лакацыі адразу па некалькіх геаграфічных параметрах.

— Але галоўнае тое, што астатняя праграмы такога кшталту не канцэнтруюцца непасрэдна на бяспецы і прапануюць вырашэнне гэтага пытання праз стварэнне чатаў для камунікацыі або чагосьці падобнага. Наша ж скіравана на прамое ўзаемадзеянне са службамі ратавання і ўсімі, хто можа дапамагчы, — запэўнівае Ягор.

На цяперашні момант праграма функцыянуе, і ёй можна карыстацца, але яе дапрацоўка вядзецца бесперапынна: выпраўляюцца «багі» і недасканаласці, што былі згаданыя ў водгуках карыстальнікаў. Праўда, каманда мае і свае задумкі. У планах — перайсці на новую ступень развіцця праграмы і зрабіць яе спрацоўванне аўтаматычным, як і вызначэнне экстраннай сітуацыі. Напрыклад, пры ДТЗ тэлефон зрэагуе на рэзкі ўдар. Акрамя таго, праграма зможа вызначыць сітуацыю, калі дзіця перайшло дарогу ў неналежным месцы, і паведаміць пра гэта бацькам.

— На сённяшні дзень мы засяроджваем увагу выключна на #ButtonSOS, і развіццё гэтай праграмы з'яўляецца нашай галоўнай справай, — сцвярджае Ягор. — Мы маладыя стартап, які шукае свайго карыстальніка, таму зараз наша галоўная мэта — давесці інфармацыю аб праграме і яе функцыі да апошняга.

**Таццяна АШУРКЕВІЧ,**
**студэнтка II курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
БРСМ СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ ЧЫРВОНКА

# РОБЯЧЫ ДАБРО, ДАКРАНУЦЦА ДА ВЕЧНАГА

**Кіраўнікі асноўных рэлігійных канфесій Беларусі на закрыцці рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі — 2017» у Доме міласэрнасці ў сталіцы далі высокую ацэнку тым намаганням, якія валанцёры руху БРСМ «Добрае Сэрца» прыклалі ў добраўпарадкаванне і рэканструкцыю культавых аб'ектаў. У 2017 годзе такіх налічвалася 283 па ўсёй краіне: 227 праваслаўных, 48 каталіцкіх і 8 — іншых канфесій.**



Перад пачаткам сустрэчы валанцёры руху БРСМ «Добрае Сэрца» паўдзельнічалі на тэрыторыі Дома міласэрнасці ў працоўнай акцыі «Падорым свет дзецям». Хлопцы і дзяўчаты займаліся добраўпарадкаваннем дзіцячай пляцоўкі, а таксама рэканструявалі аснову звона «Міра і справядлівасці».

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі адзначыў, што дзякуючы акцыі маладыя людзі больш даведваюцца аб сваёй гісторыі, вучацца рабіць добрыя справы, якія іх гуртуюць. «Вельмі важна, што хлопцы і дзяўчаты далучаюцца да духоўных вытокаў. Яны вучацца тварыць, ствараць, хоць пачынаюць з простай уборкі смецця», — адзначыў мітрапаліт Павел.

Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі архіепіскап Тадэвуш Кандрусевіч таксама звярнуў увагу на значнасць для грамадства такой дзеі, як аднаўленне і добраўпарадкаванне культавых аб'ектаў. «Гісторыя — гэта аснова, на якой будуецца будучае жыццё», — падкрэсліў ён. Тадэвуш Кандрусевіч падзякаваў валанцёрам, якія прымалі ўдзел у акцыі, распрацоўвалі новыя турыстычныя маршруты па святых мясцінах Беларусі. Падобнае меркаванне выказаў і галоўны равін Рэлігійнага аб'яднання абшчын прагрэсіўнага іўдаізму Рыгор Абрамовіч. Ён дадаў, што дабрачынная дзейнасць дапамагае грамадству згуртавацца, і валанцёрскі рух «Добрае Сэрца» — яскравы таму прыклад. Яго ўдзельнікі сумесна з асноўнымі канфесіямі Беларусі праводзяць ва ўсіх рэгіёнах краіны працоўныя акцыі па добраўпарадкаванні і аднаўленні храмаў, манастыроў, свяцілішчаў, капэл, прыдарожных крыжоў, святых крыніц.

У Доме міласэрнасці на падвядзенне вынікаў акцыі сабралася каля 100 юнакоў і дзяўчат з усіх рэгіёнаў Беларусі. На тэматычнай выставе «Аднаўляючы святыні — будуем будучыню» валанцёры прэзентавалі ганаровым гасцям экскурсійныя маршруты «Святыні Беларусі». Створаныя моладдзю новыя адукацыйныя дарожныя карты па святых мясцінах распавядаюць пра духоўную спадчыну нашых продкаў, дапамагаюць адчуць кожнаму цудатворную атмасферу вялікіх храмаў. Адбыўся і міжканфесійны адкрыты дыялог на тэму «Беларусь — краіна міру і добрасуседства», на якім закраналіся пытанні захавання і ўмацавання міру, міжнародных партнёрскіх адносін, павагі розных нацый і канфесій. У завяршэнні валанцёрам былі ўручаны падзячныя лісты.

Ініцыятарам акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі» выступае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Яна праводзіцца з 2013 года. У 2016-м праект атрымаў падтрымку апарату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Сам сабе рэжысёр

# ЗАЛЕЖНАСЦЬ ЦІ САМАРЭАЛІЗАЦЫЯ?

## Як становяцца інстаблогерамі

**Цяпер большую частку свайго часу моладзь праводзіць у сацыяльных сетках. Дарослыя лічаць, што гэта хвароба, якая не вылечваецца. А між тым самі юнакі і дзяўчаты упэўнены, што «завісаць», значыць, самарэалізоўвацца, а не марнаваць час. Пра гэта я пагутарыла з дзвюма блогеркамі, профілі якіх маюць вялікую колькасць падпісчыкаў.**



**Яна ДУБАТОЎКА, 69 тысяч падпісчыкаў:**

— У Інстаграме я зарэгістравалася пяць гадоў таму. Спачатку не думала пра тое, як стварыць прыгожы профіль, выкладвала ўсё, што бачыла вакол сябе. Першай фатаграфіяй была звычайная прычоска, якую мне зрабіла сяброўка ў школе. Потым захацелася чагосьці большага, таму пачала глядзець профілі іншых дзяўчат, натхнялася — толькі тады зразумела, што патрэбна менавіта маёй старонцы.

Першапачаткова «вядзенне Інстаграма» для мяне было як хобі, а цяпер гэта частка жыцця. Я ўжо не ўяўляю свайго дня без гэтай сацыяльнай сеткі. Намагаюся выкладваць па адной фатаграфіі кожны дзень, але часам бяру перапынак, каб адпачыць ад тэлефона.

У кожнага сваё разуменне прыгажосці, у тым ліку і ў адносінах да фота. Мне вельмі імпануе, калі яны гарманіруюць паміж сабой у профілі. Таксама добра, калі ёсць здымкі роднага горада, прыроды. Мне самой здаецца, што я ўжо перафатаграфавала кожны метр Мінска, але ўсё роўна шукаю новыя цікавыя мясціны. Людзям, якія толькі пачынаюць сваю блогерскую дзейнасць у Інстаграме, магу параіць быць самімі сабой і не гнацца за папулярнасцю.

Калі гаварыць пра заробак, то ён, безумоўна, ёсць. Думаю, што калі рэкламаваць штосьці рэгулярна, то можна добра зарабляць. Я з задавальненнем рэкламую вопратку, касметыку, нешта смачнае, кнігі. Не стала б рабіць тое ў дачыненні да алкаголю, цыгарэт і 18+ рэчаў.

Цяпер я маю старонку, якая мяне задавальняе. Не сказала б, што чымсьці асабліва вылучаюся сярод іншых, проста раблю тое, што падабаецца. Я не ганюся за якімі-небудзь трэндамі ў Інстаграме, не выкладваю тое, што прынясе больш лайкаў толькі з-за таго, што нешта ў цяперашні момант вельмі папулярнае.



**Яна МІХАЙЛОЎСКАЯ, 10,2 тысячы падпісчыкаў:**

— Свой профіль у Інстаграме я стварыла тры гады таму. Першы фотаздымак — вінтавой лесвіцы, якая мне спадабалася. Зрабіць асабістую старонку вырашыла дзеля таго, каб у мяне было месца, куды я ў любы момант магла б выставіць фатаграфію і не думаць аб меркаваннях іншых людзей. Калі паглядзець мае здымкі ў профілі за апошнія некалькі месяцаў, то сярод бясконцых талерак, кубкаў кавы і хмарачосаў можна знайсці толькі адно фота мяне самой і ні адной раскладкі з касметыкай!

Апошнія паўгода выстаўляю фатаграфіі раз у тыдзень, бо няма вольнага часу. Спачатку было цяжка — спрабавала да кожнага здымка падабраць свой фільтр, доўга мучылася з цеплынёй і кантрастам. Але пасля ва ўсім разабралася і цяпер на апрацоўку фатаграфіі сыходзіць максімум пяць хвілін. Мінімум фільтра, мінімум кантрасту, пабольш рэзкасці і — гатова! Лічу, чым больш натуральна, тым лепш.

Калі прагартваю стужку Інстаграма, заўважаю і адзначаю толькі профілі, зробленыя з душой. Яны абавязкова павінны быць маляўнічыя, каляровыя і жывыя. Я падтрымліваю стасункі з многімі беларускімі інстаблогерамі і ўпэўнена, што ў іх ёсць чаму павучыцца. Яны вельмі адкрытыя і творчыя людзі!

Наконт рэкламы нічога канкрэтнага не магу сказаць, бо прапаноў не паступала, але я з вялікім задавальненнем пагадзілася б прапіярыць які-небудзь рэстаран ці кавярню. За статыстыкай сачу, але вельмі рэдка — а навошта? Я ж раблю гэта дзеля сябе найперш. Наконт залежнасці ад колькасці лайкаў або падпісчыкаў... Так, часам яна праяўляецца. Асабліва, калі пачынаеш параўноўваць фатаграфіі. Але гэта ненадоўга, трэба супакоіцца, сказаць, што гэта ўсё глупства і пайсці займацца сваімі справамі.

**Дар'я ШЛАПАКОВА,**
**студэнтка III курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «ВРЕМЯ ОТДЫХАТЬ С БЕЛКАРТ!»

БЕЛКАРТ
Тебе ближе

**1. Наименование рекламной игры.**

Настоящая рекламная игра называется «Время отдыхать с БЕЛКАРТ!» (далее – «Игра»), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее – «Правила») согласно требованиям законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры дополнительной платы.

**2. Сведения об Организаторе.**

**2.1.** Организатором Игры является Общество с ограниченной ответственностью «Мятный знак», УНП 192325716, зарегистрировано 20 августа 2014 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №192325716 (далее – Организатор).

**2.2.** Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Октябрьская, 19Б, оф. 6, этаж 3.

**2.3.** Заинтересованным лицом Игры является Закрытое акционерное общество «Платежная система БЕЛКАРТ».

**3. Территория проведения Игры.**

Игра поводится на территории Республики Беларусь.

**4. Период проведения Игры.**

Игра проводится в период с 01.10.2017 г. по 27.03.2018 г., включая период розыгрыша и вручения призов.

**5. Комиссия по проведению Игры.**

Для контроля за ходом Игры создается Комиссия по ее проведению. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения Игры. Комиссия состоит из председателя и 4 членов.

Председатель Комиссии:

Никифорова Ольга Александровна, директор ООО «Мятный знак».

Члены комиссии:

Шубич Татьяна Леонидовна, специалист по маркетингу ООО «Мятный знак»;

Протько Марина Вячеславовна, главный бухгалтер ООО «Мятный знак»;

Данишевская Ольга Геннадьевна, начальник отдела маркетинга управления развития платежной системы ЗАО «Платежная система БЕЛКАРТ»;

Шибко Екатерина Валерьевна, главный специалист отдела маркетинга управления развития платежной системы ЗАО «Платежная система БЕЛКАРТ».

Комиссия осуществляет контроль за соблюдением установленных Правил проведения Игры, рассматривает возникшие жалобы и предложения со стороны Участников.

Члены комиссии обязаны осуществлять возложенные на них полномочия в течение срока проведения Игры.

**6. Наименование товаров (работ, услуг) или их групп, в целях стимулирования реализации, которых проводится Игра.**

**6.1.** Игра проводится в целях стимулирования проведения безналичных платежей с использованием личных банковских платежных карточек БЕЛКАРТ либо кобейджинговых карточек БЕЛКАРТ-ПРЕМИУМ-Maestro или БЕЛКАРТ-СТАНДАРТ-Maestro, на счета которых осуществляется зачисление пенсионных выплат по возрасту (далее – карточки БЕЛКАРТ), эмитированных следующими банками-участниками платежной системы БЕЛКАРТ: ОАО «АСБ Беларусбанк», ОАО «Белагропромбанк», ОАО «Приорбанк», ОАО «Белинвестбанк», ОАО «БПС – Сбербанк».

**6.2.** При использовании в Правилах термина «банковская платежная карточка» используется в значении, определенном статьей 273 Банковского кодекса Республики Беларусь: «Банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь».

**7. Участники Игры.**

**7.1.** Участниками Игры могут быть граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, постоянно проживающие в Республике Беларусь и достигшие на момент начала Игры общеустановленного пенсионного возраста и являющиеся держателями карточки БЕЛКАРТ (в соответствии со ст.11 Закона Республики Беларусь от 17 апреля 1992 года «О пенсионном обеспечении» и Указом Президента Республики Беларусь от 11 апреля 2016 г. №137 «О совершенствовании пенсионного обеспечения» пенсионный возраст для мужчин – 60 лет 6 месяцев, женщин – 55 лет 6 месяцев).

**7.2.** Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, а также Члены комиссии.

**7.3.** Физическое лицо может участвовать в Игре количество раз, равное количеству безналичных операций (транзакций), совершенных с использованием карточки БЕЛКАРТ в соответствии с условиями участия в Игре.

**8. Условия участия в Игре.**

**8.1.** Для участия в Игре физическому лицу необходимо:

**8.1.1.** Являться держателем карточки БЕЛКАРТ следующих банков (далее – Банки): ОАО «АСБ Беларусбанк», ОАО «Белагропромбанк», ОАО «Приорбанк», ОАО «Белинвестбанк», ОАО «БПС – Сбербанк».

**8.1.2.** В период с 00 часов и 00 минут 01.10.2017 года по 23:59:59 31.12.2017 года включительно совершить с использованием карточки БЕЛКАРТ безналичную операцию на территории Республики Беларусь на сумму не менее 25 (двадцати пяти) белорусских рублей 00 копеек по оплате (приобретению) товаров/работ/услуг в организациях торговли (сервиса) на территории Республики Беларусь, в том числе в сети Интернет, за исключением операций согласно п. 8.5.

**8.2.** Определение участников Игры, соответствующих настоящим Правилам, производится по каждой произведенной держателем карточки БЕЛКАРТ безналичной операции (транзакции) отдельно. Порядковые номера транзакциям (далее – База данных безналичных операций) присваиваются Организатором в соответствии с настоящими Правилами и в зависимости от даты и времени совершения платежа.

**8.3.** В случае если одно физическое лицо произвело несколько безналичных операций (транзакций), соответствующих настоящим Правилам, данное физическое лицо фиксируется в качестве участника Игры соответствующее количество раз.

**8.4.** Соблюдать нормы законодательства Республики Беларусь и правила пользования банковскими платежными карточками, установленными банком-эмитентом.

**8.5.** Не являются основанием для участия в Игре:

– безналичные операции, совершенные до и после периода, указанного в п. 8.1.2;

– безналичные операции на сумму, не соответствующую условиям п. 8.1.2;

– операции по снятию наличных денежных средств или пополнению карт-счета;

– операции по переводу денежных средств с одной банковской платежной карточки на другую банковскую платежную карточку;

– операции по оплате коммунальных услуг;

– операции по размещению (пополнению) депозитов;

– операции по оплате кредитных обязательств и банковских комиссий;

– операции по оплате налогов, штрафов, взносов, обязательных государственных пошлин.

**9. Состав и размер призового фонда.**

Призовой фонд Игры составляет сумму в размере 15 149 (пятнадцать тысяч сто сорок девять) белорусских рублей 16 копеек, формируется за счет денежных средств Заинтересованного лица и состоит из:

1) Приз первого порядка (состоит из):

| № п/п | Наименование призов, участвующих в розыгрыше | Название приза далее в Правилах | Кол-во (шт.) | Стоимость за 1 ед., белорусских рублей | Всего стоимость, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Плед "Nashville" 120*180 см, флис./полиэстер., т.-синий + нанесение логотипа | Плед | 40 | 16,26 | 650,40 |
| 2 | Зонт-трость п/автомат 105 см, ручка дерев. "Nancy" т.-синий + нанесение логотипа | Зонт-трость | 40 | 17,82 | 712,80 |

2) Приз второго порядка:

| № п/п | Наименование призов, участвующих в розыгрыше | Название приза далее в Правилах | Кол-во (шт.) | Стоимость за 1 ед., белорусских рублей | Всего стоимость, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Подарочный сертификат «Электросила» номиналом 190 рублей + денежная сумма в размере 11,80 бел. руб.<br>Срок действия Подарочного сертификата ограничен и действителен до 07.09.2018 г. | Подарочный сертификат «Электросила» номиналом 190 рублей | 40 | 201,80 | 8 072,00 |

3) Главный приз:

| № п/п | Наименование призов, участвующих в розыгрыше | Название приза далее в Правилах | Кол-во (шт.) | Стоимость за 1 ед., белорусских рублей | Всего стоимость, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Подарочный сертификат РУП «ЦЕНТРКУРОРТ» на сумму 2500 белорусских рублей, в счет оплаты туристических услуг, оказываемых на территории Республики Беларусь + денежная сумма в размере 356,98 бел. руб.<br>Срок действия Подарочного сертификата ограничен и действителен по 07.09.2018 г. | Подарочный сертификат на отдых в санатории РБ на двоих человек номиналом 2500 рублей | 2 | 2 856,98 | 5 713,96 |

**10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда.**

**10.1.** Место проведения розыгрыша – Республика Беларусь, г. Минск, проспект Победителей, 7А, офис 55, 17-й этаж.

**10.2.** Розыгрыш призового фонда проводится открыто с возможностью присутствия на нем участников Игры. Результаты розыгрыша Игры не должны зависеть от воли Организатора и не могут быть никем специально устроены.

**10.3.** Всего за период проведения Игры Организатором проводится 2 (два) розыгрыша призового фонда, согласно Таблице 1, в ходе которых Победители будут определяться из списков участников Игры, сформированных Организатором в соответствии с настоящими правилами и совершивших безналичные операции (транзакции) в установленный период:

Таблица 1

| Номер розыгрыша | Участвуют Участники, которые совершили безналичные операции (транзакции) в период | Дата и время розыгрыша | Призовой фонд для каждого розыгрыша |
|---|---|---|---|
| 1 | с 01.10.2017 г. (00:00:00) по 15.11.2017 г. (23:59:59) | 24.11.2017 г. в 11.00 | Плед – 20 штук<br>Зонт-трость – 20 штук<br>Подарочный сертификат «Электросила» номиналом 190 рублей – 20 штук<br>Подарочный сертификат на отдых в санатории РБ на двоих человек номиналом 2500 рублей – 1 штука |
| 2 | с 16.11.2017 г. (00:00:00) по 31.12.2017 г. (23:59:59) | 10.01.2018 г. в 11.00 | |

**10.4.** В розыгрышах Призов принимают участие все участники Игры, совершившие безналичные операции (транзакции) в соответствии с настоящими Правилами.

**10.5.** Призы разыгрываются в последовательности, указанной в п. 10.3. Правил.

**10.6.** Для осуществления розыгрышей Призов Организатор формирует из базы данных безналичных операций, соответствующим Правилам, уникальные номера (далее – «номера») в хронологическом порядке согласно дате и времени совершения безналичных операций (транзакций) (далее – «массив»).

**10.7.** Для определения Победителей Призов Организатор использует лототрон и набор шаров в количестве 10 (десяти) штук с цифрами от 0 (нуля) по 9 (девять).

**10.8.** Определение выигрышных номеров Призов происходит путем их формирования слева направо из цифр в шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

**10.9.** Для определения цифры первого слева разряда выигрышного номера Организатор помещает в лототрон шары с цифрами от 0 (нуля) до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего по порядку номера в массиве. Член комиссии извлекает из лототрона один шар. Цифра из извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

**10.10.** Далее в лототрон загружаются все десять шаров. Шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, цифра в котором определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах номеров массива. При наличии совпадения цифра вытянутого шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера – и шар возвращается в лототрон; в противном случае – извлеченный шар с цифрой не возвращается в лототрон, и Член комиссии извлекает следующий шар до получения нужного совпадения. Шары извлекают до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон цифр соответствующих разрядов номеров в массиве. Таким образом, формируются все выигрышные номера Победителей Призов.

**10.11.** После определения Победителей Призов каждого розыгрыша для обеспечения полной выдачи призов Организатор для каждого Приза определяет Резервных победителей в количестве согласно Таблице 2. Определение выигрышных номеров Резервных победителей происходит следующим образом, установленным в п.10.7. – 10.10. Правил.

Таблица 2

| № п/п | Наименование Приза | Количество Резервных победителей |
|---|---|---|
| 1 | Плед | 10 |
| 2 | Зонт-трость | 10 |
| 3 | Подарочный сертификат «Электросила» номиналом 190 рублей | 10 |
| 4 | Подарочный сертификат на отдых в санатории РБ на двоих человек номиналом 2500 рублей | 2 |

**10.12.** Призы вручаются Резервным победителям в случае если основной Победитель:

**10.12.1.** отказывается от получения Приза, о чем письменно извещает Организатора;

**10.12.2.** не представляет необходимые подтверждающие документы, указанные в Правилах, в сроки и в порядке, установленные Правилами;

**10.12.3.** не является для получения Приза в сроки, установленные Правилами.

**11. Срок и способ информирования победителей розыгрыша призового фонда. Место, порядок и срок выдачи выигрышей.**

**11.1.** Организатор уведомляет Победителей/Резервных победителей о выигрыше по телефону и письменно заказным письмом с уведомлением в сроки, указанные в Таблице 3.

**11.2.** После получения письменного уведомления Победитель/Резервный победитель, претендующий на получение Приза, должен связаться с Организатором и предоставить письменное согласие на получение Приза или отправить таковое в электронном виде на 3355110@tut.by в сроки, указанные в Таблице 3.

**11.3.** Организатор отправляет Призы первого порядка и Призы второго порядка Победителям/Резервным победителям по почте с уведомлением о доставке в сроки, указанные в Таблице 3.

**11.4.** Организатор вручает Главный приз Победителю/Резервному победителю в отделении банка-эмитента, выпустившего карточку БЕЛКАРТ по месту жительства Победителя в сроки, указанные в Таблице 3.

Таблица 3

| Номер розыгрыша | Сроки уведомления | Сроки для связи с Организатором для предоставления письменного согласия на получение Приза | Сроки отправки и выдачи Призов |
|---|---|---|---|
| Основные победители | | | |
| 1 | по 12.12.2017 г. включительно | по 26.12.2017 г. включительно | по 04.01.2018 г. включительно |
| 2 | по 26.01.2018 г. включительно | по 09.02.2018 г. включительно | по 16.02.2018 г. включительно |
| Резервные победители | | | |
| 1 | в течение 2 (двух) дней с момента определения Победителем Приза по 16.01.2018 г. включительно | по 30.01.2018 г. включительно | по 06.02.2018г. включительно |
| 2 | в течение 2 (двух) дней с момента определения Победителем Приза по 06.03.2018 г. включительно | по 20.03.2017 г. включительно | по 27.03.2018 г. включительно |

**11.5.** При получении Главного приза Победитель должен представить Организатору паспорт и пенсионное удостоверение или документ, его заменяющий.

**11.6.** В случае если Победитель не может получить Главный приз лично, Главный приз может получить его законный представитель (доверенное лицо), предоставив лично доверенность от Победителя на получение Главного приза, заверенную нотариально.

**11.7.** Победитель теряет право получения Главного приза в случае если:

– отказался от получения Главного приза, о чем письменно известил Организатора Игры, по адресу 220030, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Октябрьская, 19Б, оф. 6, этаж 3;

– не представил необходимые подтверждающие документы, указанные в Правилах, в сроки и в порядке, установленные Правилами;

– не явился для получения приза в сроки, установленные Правилами.

**11.8.** Победитель при получении Главного приза письменно подтверждает факт его получения и заполняет все необходимые документы, представленные Организатором и связанные с получением приза.

**11.9.** Выплата денежного эквивалента приза не допускается.

**11.10.** Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь и осуществляется Организатором. Удержание с Победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи приза из денежной части приза (денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

**12. Права и обязанности участников Игры.**

**12. 1.** Принимая участие в Игре, участники подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования Правил и законодательства, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением Призов.

**12. 2.** Победители вправе согласиться на рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в глобальной компьютерной сети Интернет, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты им какого-либо вознаграждения в рамках данной Игры.

**12. 3.** Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио и видео интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Игры. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

**12. 4.** Победители, претендующие на получение Призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые для их получения документы (включая согласие на передачу Банком личной информации третьим лицам), предоставляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения призов.

**13. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрышей, сроки публикации.**

**13.1.** Правила Игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Игры.

**13.2.** Результаты розыгрышей Игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 23.03.2018 г.

**14. Порядок предоставления информации по вопросам проведения Игры.**

**14.1.** Все возможные вопросы и претензии участников в отношении организации и условий передачи Призов первого порядка, Призов второго порядка и Главного приза должны быть адресованы Организатору Игры по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Октябрьская, 19Б, оф. 6, этаж 3.

**14.2.** Информацию об условиях участия и проведения Игры с 01.10.2017 года по 27.03.2018 года можно получить по телефону 8 033 335 51 10 в рабочие дни с 10.00 до 17.00, а также на сайте www.belkart.by.

**15. Общие положения.**

**15.1.** Организатор не вступает в споры между участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

**15.2.** Организатор не несет ответственности за качество работы почтовых служб, в частности за недоставку либо несвоевременную доставку почтовой корреспонденции.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №3097 от 13 сентября 2017 года выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь

*На сваім месцы*

# НАВУЧЫЦЦА КІРАВАЦЬ

Такое патрабаванне ў маладога кіраўніка Горацкага ДТСААФ — і да сябе, і да курсантаў

**Аляксандр БЯЗРУЧАНКА нарадзіўся і жыве ў Горках. У 2010 годзе скончыў факультэт механізацыі сельскай гаспадаркі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі, паралельна вучыўся на факультэце бізнесу і права. Пасля паўтара года працаваў асістэнтам у акадэміі і вучыўся ў аспірантуры. Адслужыўшы ў арміі, працягнуў работу выкладчыкам на кафедры бяспекі жыццядзейнасці. А паўтара года таму нечакана для сябе стаў старшынёй раённай структуры ДТСААФ. І адразу сутыкнуўся з няпростымі задачамі: разабрацца ў сур'ёзнай справе падрыхтоўкі кіроўцаў, набраць добрых выкладчыкаў і майстроў, зрабіць грунтоўны рамонт... І ўсё гэта — у дастаткова маладым узросце.**



Мы сустракаемся ў сценах новага будынка аўташколы. У параўнанні са старым гэты — утульны, светлы.

— Канчаткова пераехалі зусім нядаўна, — дзеліцца Аляксандр. — На працягу двух гадоў рабілі рамонт, каб навесці парадак унутры і звонку. З нуля пабудавалі аўтадром і эстакаду. Раней мелі адзін клас, дзе было не сорамна займацца з курсантамі, зараз — тры вялікія прасторныя для падрыхтоўкі кіроўцаў катэгорый А, В і перападрыхтоўкі з катэгорыі С на СЕ. Ёсць лабараторыя, дзе стаіць рабочы трэнажор аўтамабіля ЗІЛ-130, які актыўна задзейнічаны ў вучэбным працэсе. А яшчэ на адкрыцці нам зрабілі цудоўны падарунак — новы аўтамабіль «Рэно Логан». Дарэчы, на ім хоча вучыцца амаль палова курсантаў. Але не ўсе. У нашым «аўтапарку» — адзін грузавы і пяць легкавых аўтамабіляў. Ёсць сярод іх і «Жыгулі». Ахвотных сесці за руль апошніх таксама хапае, бо існуе меркаванне, што калі навучышся ездзіць на «Жыгулях», дык зможаш кіраваць любой машынай! Так ці не? Прыходзьце, праверым!

...На аўтадроме на «Рэно» адпрацоўвае элементы дзяўчына з майстрам. Здзіўляюся, што вучыць яе амаль мой равеснік.

— Так, сапраўды, у нас даволі малады калектыў, — адзначае Аляксандр. — Сярэдні ўзрост супрацоўнікаў каля трыццаці гадоў. Хоць працуюць у нас і людзі старэйшага ўзросту. Увогуле, з маім прыходам калектыў павялічыўся ўдвая — зараз нас чатырнаццаць. Прыйшлі маладыя выкладчыкі і майстры па ваджэнні. Канешне, да іх бывае недавер, але паказчыкі здачы экзаменаў у ДАІ нашымі курсантамі гавораць самі за сябе — ад 70 да 95 працэнтаў. Нават 100 працэнтаў сёлета было!

— Дарэчы, цяжка быць маладым кіраўніком?

— Складанае пытанне, — задумваецца Аляксандр. — На пасаду старшыні я прыйшоў, калі мне было 28 гадоў. Канешне, для сталых калег гэта несур'ёзны ўзрост. Першы час нехта глядзеў з асцярогай, маўляў, «табе яшчэ працаваць і працаваць, хлопчык». Я да гэтага стаўлюся спакойна. Усё пазнаецца ў справе. Тым больш, што такія выпадкі — хутчэй, выключэнне. Большасць дапамагаюць і словам, і справай. Асабліва тата, ён у мяне кіраўнік з трыццацігадовым стажам!

Аляксандр сам выкладае курсантам, рыхтуе да атрымання катэгорыі В.

— Калі стаў старшынёй, з'явілася неабходнасць падстрахоўваць сваіх выкладчыкаў. Кадраў не хапала, таму адвучыўся і атрымаў пасведчанне на выкладанне Правілаў дарожнага руху. Цяпер разумею, што такі вопыт цудоўна спрыяе паглыбленаму вывучэнню сваёй справы. Разабраўся да дробязяў. Гэта вельмі важна, калі кіраўнік разумее ўсе тонкасці рабочага працэсу і глядзіць на перспектыву. Трэба змагацца за сваю арганізацыю! Таму нядаўна я адвучыўся і на майстра вытворчага навучання і зараз смела змагу замяніць і майстроў-інструктараў.

Другі год запар Аляксандр наведвае школы горада і расказвае пра навучанне ў сваёй установе. Як вынік — сёлетнім летам набралася група дзесяцікласнікаў, якія прагнуць атрымаць правы. Канешне, пакуль здаваць экзамены ў Дзяржаўтаінспекцыі хлопцы і дзяўчаты не могуць (ім яшчэ па 16—17 гадоў), але пры паспяховай здачы ўнутраных іспытаў ім выдаецца пасведчанне, з якім пры наступленні паўналецця можна смела ісці здаваць іх у Міжраённы рэгістрацыйна-экзаменацыйны аддзел Дзяржаўнай інспекцыі бяспекі дарожнага руху.

— Лета паміж 10-м і 11-м класамі — самае свабоднае. Няма экзаменаў, не трэба паступаць. Менавіта таму школьнікі з задавальненнем ідуць да нас. Летась мы набралі групу з васьмі школьнікаў, сёлета — з дванаццаці. І, як правіла, вынікі менавіта ў падлеткаў самы лепшыя! Напэўна, яны па звычцы добра вучацца *(смяецца)*. Бо старэйшыя па ўзросце курсанты часам лянуюцца, бывае, ставяцца да працэсу несур'ёзна, прапускаюць заняткі. І як вынік — перaздачы і ў аўташколе, і ў ДАІ. Бо ад выкладчыка залежыць толькі пяцьдзясят працэнтаў поспеху. Калі не прыкладаць намаганняў, тады гэта не вучоба, а фактычна выкінутыя на вецер грошы.

— А хваляванне?

— Так, гэта праблема любога ўзросту! Калі курсанты першы раз здаюць экзамен у ДАІ, могуць разнервавацца да такога стану, што забываюць пра ўсё на свеце, нават як клавішы націскаць, не тое што Правілы дарожнага руху. Менавіта таму мы сумесна з кіраўніцтвам Горацкага МРЭА хочам арганізоўваць невялічкія экскурсійныя наведванні месца, дзе прымаюць тэарэтычны экзамен. Спадзяёмся, што гэта дапаможа перамагчы страх.

**Марына БЕГУНКОВА,**
**фота аўтара.**
*Мінск — Горкі — Мінск.*



**Каля 80 працэнтаў навучэнцаў — прадстаўніцы прыгожага полу.**



**Курсанты заўсёды смела ідуць па парадку.**

# «ЗА ТЫДЗЕНЬ... 50 АПЕРАЦЫЙ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Сваю першую аперацыю хлопец правёў, яшчэ калі вучыўся на чацвёртым курсе. Яму даверылі выдаліць атэрому на галаве (запаленне сальнай залозы). «Я зрабіў усё сам: ад разрэзу да накладання швоў. Хваляваўся, вядома. Хоць гэта самая простая хірургічная аперацыя, але на той момант для мяне яна была маленькай перамогай», — прызнаецца суразмоўнік.

## У СЯМІКІЛАГРАМОВЫМ «КАСЦЮМЕ»

— Слухаю, — падымае Яўген тэлефон. — Пацыент ужо на стале? Іду.

Часу сядзець у кабінеце няма. Мы з фатографам надзяваем бахілы, шапачкі, накідкі і спяшаемся за маладым урачом. Аказваемся ў пакоі, суседнім з аперацыйнай: праз вялікае шкло відаць усё, што адбываецца на хірургічным стале.

А там — амаль ювелірная работа. Арыентавацца ўнутры сасудаў урачам дапамагае рэнтген-апарат: здымкі транслююцца на вялікія маніторы. Наколькі медыкі абаронены ад апрамянення? Перад імі стаяць спецыяльныя экраны: яны прыкрываюць органы зроку і галаву. Пад халат надзяваецца свінцовая абарона: спадніца, камізэлька і фартух на шыю. Вага касцюма прыкладна 6—7 кілаграмаў.

Сярод пацыентаў, што трапляюць да рэнтгенэндаваскулярных хірургаў, — людзі, якія перанеслі інсульт, інфаркт міякарда, маюць праблемы з кровазабеспячэннем унутраных органаў. Урачы могуць спыніць нават рост пухліны: для гэтага перакрываюць сасуд, які яе жывіць. Але казаць, што хірургі сёння ўсёмагутныя, не выпадае. Асабліва гэта датычыцца злаякасных захворванняў. Якасць жыцця пры маштабных апераацыях не паляпшаецца. Таму хірург заўсёды ўзважвае, ці варта іх рабіць. Але ў першую чаргу за сваім здароўем павінен сачыць сам пацыент.

...Мы чакаем у калідоры. А потым, калі Яўген вызваліўся, цікавімся: як пацыенты ставяцца да таго, што іх лечыць такі малады ўрач?

— Не было такога, каб нехта не давяраў, — задумваецца ён. — А вось прафесіяналы часам глядзяць на цябе звысоку. Чалавек ужо навучыўся маніпуляцыям, якія ты толькі спасцігаеш, і для яго твая праца здаецца занадта павольнай. Але ж ніхто прафесарам з медуніверсітэта не выпускаецца. Трэба спачуваць маладым спецыялістам і перадаваць ім свой досвед, бо далёка не пра ўсё можна даведацца з літаратуры.

## ДЛЯ ВАС СПЯВАЕ... УРАЧ

Акрамя медыцыны, у маладога хірурга ёсць яшчэ адно захапленне — музыка.

— Я заканчваў музычную школу па класе акардэона. Вось туды мяне прымушалі хадзіць *(смяецца)*. Было вельмі крыўдна, калі хлопцы пасля ўрокаў беглі дадому, ганялі мяч у двары, а я ішоў займацца. Але цяпер удзячны, што так атрымалася. Потым навучыўся іграць на гітары. А ў дзявятым класе мы з хлопцамі стварылі гурт і выступалі ў школах адзін у аднаго.

Ва ўніверсітэце творчасць Яўген не закінуў. Удзельнічаў у студэнцкай самадзейнасці — у народным тэатры «Панацэя». На адной з рэпетыцый пазнаёміўся з педагогам па вакале і стаў адточваць свае навыкі спеву. Цяпер выступае ў складзе кавер-бэнда «MONAKO». «Я так пераключаюся і набіраюся сіл», — кажа ён.

— Падчас выступленняў на карпаратывах экстранную медыцынскую дапамогу аказваць не даводзілася?

— На шчасце, не.

Сям'я таленавітым спецыялістам ганарыцца. А я не магу не спытаць: ці не крыўдна хірургу, калі ў інтэрнэце лаюць яго прафесію?

— Крыўдна, — прызнаецца Яўген. — У нас неяк так склалася, што ўрач і пацыент па розныя бакі барыкад стаяць. Некаторым здаецца, што іх дрэнна і няправільна лечаць, бо ў інтэрнэце напісана не так. Але ж дактары не дарма вучацца сем гадоў на ўніверсітэце. Каб усё было настолькі проста, то можна было б, пагартаўшы пару сайтаў, адкрываць свой прыватны кабінет і займацца медыцынай.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**У ангіяграфічнай аперацыйнай знаходзіцца ангіёграф, які з'яўляецца «вачамі» хірурга.**

*Найлепшыя з найлепшых*

# Хто паедзе ў Сан-Хасэ?

**У Парку высокіх тэхналогій прайшоў Нацыянальны адбор на Сусветную алімпіяду робатаў. Больш за дзвесце юных талентаў ва ўзросце ад 6 да 25 гадоў сабраліся ў бізнес-інкубатары ПВТ, каб прадэманстраваць свае веды і ўменні.**

Сусветная алімпіяда робатаў — найбуйнейшая міжнародная пляцоўка, якая дазваляе маладым удзельнікам з усяго свету прадэманстраваць свае веды ў прыкладной матэматыцы, фізіцы і праграмаванні. Спаборніцтвы, у якіх удзельнічае больш за 20 тысяч чалавек з 60 краін свету, праводзяцца ўжо трынаццаты год запар. Сёлета мерапрыемства пройдзе 10—12 лістапада ў сталіцы Коста-Рыкі — Сан-Хасэ.

На ўзровень сусветнага першынства дапускаюцца толькі самыя годныя прадстаўнікі нацыянальных зборных краін. Для вызначэння найлепшых з найлепшых, тых, хто будзе прадстаўляць дзяржаву на сусветнай арэне, кожны год праводзяцца нацыянальныя адборы. Спаборнічаюць у наступных катэгорыях: Regular, Open Category, WRO Football і Advanced Robotics Challenge.

Пераможцамі ў Regular Elementary (сярод дзяцей да 12 гадоў) стала каманда «Аксіёма 2», у Regular Junior High (сярод школьнікаў 13—16 гадоў) — «Цэнтаўра». Каманды набралі максімальную колькасць балаў з магчымых — 165 і 470 адпаведна. У катэгорыі Regular Senior High (17—19 гадоў) вызначылася каманда «Волат», якая набрала 85 ачкоў. Пераможца ў WROFootball — каманда «РБ 002» — разграміла саперніка з лікам 9:0.

Пераможцы ў катэгорыях Advanced Robotics Challenge і Open Category стануць вядомыя праз некалькі дзён. «У іх былі невялікія памылкі. Таму мы вырашылі даць час для дапрацоўкі праектаў», — растлумачыў Вадзім Кручкоў, член журы, спецыяліст па сувязях з грамадскасцю «Школы робататэхнікі».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24 |

**Предмет аукциона**
**Местоположение – Минская обл., Минский р-н**

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (населенный пункт) |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | | | |
| **Магазин №25** | 54,4 кв. м | 600/С-139863 | Хатежинский с/с, д. Дубенцы, ул. Центральная, 11А |
| Составные части и принадлежности: пристройка | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0484 га** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина №25 (срок действия по 10.07.2037) | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 12 000,00 бел. руб.** (снижена на 40%) | | | |
| **Лот №2** | | | |
| **Здание магазина №36** | 150 кв. м | 600/С-155271 | Шершунский с/с, д. Рогово, ул. Гастелло, 4А |
| Составные части и принадлежности: пристройка, хоз. блок | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0771 га** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина №36 (срок действия по 29.09.2043) с установленными ограничениями (зона отдыха «Вязынка») | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 30 000,00 бел. руб.** (снижена на 40%) | | | |
| **Лот №3** | | | |
| **Магазин №37** | 37,5 кв. м | 600/С-139783 | Роговский с/с, д. Чировичи, 17А |
| Составные части и принадлежности: пристройка | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0158 га** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина №36 (срок действия по 18.09.2042) с установленными ограничениями (зона отдыха «Вязынка») | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 2 400,00 бел. руб.** (снижена на 40%) | | | |
| **Лот №4** | | | |
| **Заготовительный павильон** | 257,2 кв. м | 600/С-153282 | г. Заславль, ул. Набережная, д. 2Г |
| Составные части и принадлежности: пристройка | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0158 га** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина №36 (срок действия по 18.09.2042) с установленными ограничениями (зона отдыха «Вязынка») | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 76 000,00 бел. руб.** (снижена на 15%) | | | |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона.

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 02.09.2017 г.

**Аукцион состоится 17.10.2017 г.** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.
Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 13.10.2017 г.** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by**. Email: auction@cpo.by**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомсельмаш» (продавец) извещает о проведении 31 октября 2017 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20%), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20%), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. №350/С-69102**, **площадью 966,6 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание заводоуправления. Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000003001610** площадью **68,5300 га** – для содержания и обслуживания административно-хозяйственных зданий и сооружений по ул. Ефремова **(доля в праве, право постоянного пользования).** Земельный участок под объект продажи будет выделен по заявке нового собственника, согласно законодательству РБ. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Ефремова М. Г., д. 63. Ограничение (обременение):** договоры аренды, площадь, сданная в аренду – **153,4 кв. м.** | **206 500,20** | 10 325,01 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. №350/С-82143**, **площадью 1 348,5 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное. Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000003000777** площадью **0,0588 га** – для эксплуатации и обслуживания здания управления кадров **(право аренды).** Местонахождение: **г. Гомель, ул. Рабочая, д. 17.**<br>**Капитальное строение с инв. №350/С-160035**, **площадью 0,0 кв. м, протяженность – 85,0 м,** назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **водопроводная сеть.** Адрес: **г. Гомель, водопроводная сеть от ВК2 до здания управления кадров по ул. Рабочая, д. 17.**<br>**Капитальное строение с инв. №350/С-160034**, **площадью 0,0 кв. м, протяженность – 34,7 м,** назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **канализационная сеть.** Адрес: **г. Гомель, канализационная сеть от КК1 до КК3 на территории, прилегающей к зданию управления кадров по ул. Рабочая.**<br>**Капитальное строение с инв. №350/С-160642**, **площадью 0,0 кв. м, протяженность – 80,0 м,** назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **линия электропередачи.** Адрес: **г. Гомель, линия электропередачи от здания учебного центра по ул. Рабочая, д. 15 до здания управления кадров по ул. Рабочая, д. 17.**<br>**Ограничение (обременение):** договоры аренды, площадь, сданная в аренду – **89,3 кв. м** | **262 957,20** | 13 147,86 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. №350/С-163045**, **площадью 457,7 кв. м,** назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – **здание специализированное розничной торговли (магазин). Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000003003043** площадью **0,0538 га** – для эксплуатации и обслуживания здания специализированного розничной торговли (магазин) **(право аренды).** Местонахождение: **г. Гомель, ул. Шоссейная, 41В.** | **456 000,00** | 22 800,00 |
| 4 | **Капитальное строение с инв. №350/С-70394**, **площадью 1 092,4 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание корпуса №56. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000003003041,** площадью **0,0990 га** – для эксплуатации и обслуживания здания административно-хозяйственного **(право аренды).** Местонахождение: **г. Гомель, ул. Шоссейная, 41Б. Ограничение (обременение):** договоры аренды, площадь, сданная в аренду – **396,1 кв. м (** в т. ч. в безвозмездное пользование – **231,4 кв. м).** | **469 800,00** | 23 490,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомсельмаш». Контактный тел.: 8 (0232) 59-57-14 – Старушкова Татьяна Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5%.**
**Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY34BAPB30122093700130000000, БИК BAPBBY23912, Филиал ОАО «Белагропромбанк» ГОУ, УНП 400071204,ОКПО 285728963000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);
**2).** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 28 сентября 2017 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 30 октября 2017 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**.Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **15 (пятнадцати)** календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех)** рабочих дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы».**

## Извещение о проведении аукциона ЕРЕМИНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность, расположенных на территории Ереминского сельсовета

| Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Начальная цена предмета аукциона | Затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, подлежащие возмещению победителем аукциона | Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета |
|---|---|---|---|---|
| 321083201601001644<br>строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1225 га. С ограничением (обременением) прав на земельный участок на площади 0,0052 га в связи с его расположением в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры (охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт). Гомельская область, Гомельский район, Ереминский сельсовет, агрогородок Еремино, в районе ул. Хованского Н. П., участок №20 | Водопровод имеется. Газопровод нет. Электрификация имеется. Дорога щебеночно-гравийное покрытие. | 16 598,46 (Шестнадцать тысяч пятьсот девяносто восемь рублей 46 копеек) | Расходы в сумме 1352,43 (Одна тысяча триста пятьдесят два рубля 43 копейки) + расходы, связанные с опубликованием объявления | Задаток в сумме 1659,85 (Одна тысяча шестьсот пятьдесят девять рублей 85 копеек) на р/с BY85AKBB36414140900333100000 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, получатель Ереминский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901 |
| 321083201601001632<br>строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1224 га. С ограничением (обременением) прав на земельный участок на площади 0,0041 га в связи с его расположением в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры (охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт) Гомельская область, Гомельский район, Ереминский сельсовет, агрогородок Еремино, в районе ул. Хованского Н. П., участок №24 | Водопровод имеется. Газопровод нет. Электрификация имеется. Дорога щебеночно-гравийное покрытие. | 16 369,42 (Шестнадцать тысяч триста шестьдесят девять рублей 42 копейки) | Расходы в сумме 1366,08 (Одна тысяча триста шестьдесят шесть рублей 08 копеек) + расходы, связанные с опубликованием объявления | Задаток в сумме 1636,94 (Одна тысяча шестьсот тридцать шесть рублей 94 копейки) на р/с BY85AKBB36414140900333100000 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, получатель Ереминский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901 |
| 321083201601001642<br>строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1225 га. С ограничением (обременением) прав на земельный участок на площади 0,0041 га в связи с его расположением в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры (охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт) Гомельская область, Гомельский район, Ереминский сельсовет, агрогородок Еремино, в районе ул. Хованского Н. П., участок №25 | Водопровод имеется. Газопровод нет. Электрификация имеется. Дорога щебеночно-гравийное покрытие. | 16 598,46 (Шестнадцать тысяч пятьсот девяносто восемь рублей 46 копеек) | Расходы в сумме 1359,42 (Одна тысяча триста пятьдесят девять рублей 42 копейки) + расходы, связанные с опубликованием объявления | Задаток в сумме 1659,85 (Одна тысяча шестьсот пятьдесят девять рублей 85 копеек) на р/с BY85AKBB36414140900333100000 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, получатель Ереминский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901 |
| 321083201601001640<br>строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) площадью 0,1255 га. С ограничением (обременением) прав на земельный участок на площади 0,0032 га в связи с его расположением в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры (охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт). Гомельская область, Гомельский район, Ереминский сельсовет, агрогородок Еремино, в районе ул. Хованского Н. П., участок №32 | Водопровод имеется. Газопровод нет. Электрификация имеется. Дорога щебеночно-гравийное покрытие. | 16 784,01 (Шестнадцать тысяч семьсот восемьдесят четыре рубля 01 копейка) | Расходы в сумме 1436,63 (Одна тысяча четыреста тридцать шесть рублей 63 копейки) + расходы, связанные с опубликованием объявления | Задаток в сумме 1678,40 (Одна тысяча шестьсот семьдесят восемь рублей 40 копеек) на р/с BY85AKBB36414140900333100000 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, получатель Ереминский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901 |

**Аукцион проводится 1 ноября 2017 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, в административном здании Гомельского райисполкома (малый зал, 3-й этаж).**

**Заявления об участии в аукционе и прилагаемые к ним документы принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Еремино, ул. Советская, 150, 1-й этаж, кабинет 4 с даты опубликования по 25.10.2017 с 8.30 до 17.00, обед – 13.00–14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.**

Условия участия в аукционе.

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в частную собственность по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с Ереминским сельским исполнительным комитетом соглашение установленной формы.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона, а также заключившие соглашение.

После получения необходимых документов от гражданина на участие в аукционе комиссия выдает ему билет участника аукциона с указанием даты регистрации заявления и номера, под которым он будет участвовать в аукционе. Данные о каждом участнике аукциона заносятся в книгу регистрации участников аукциона.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона на аукцион приравнивается к письменному отзыву заявления об участии в нем. При этом участнику аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка.

Письменный отзыв заявления или неявка участника аукциона на аукцион регистрируется в книге регистрации участников аукциона.

Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются в комиссию после окончания аукциона.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

1. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

1.1. внести плату за право приобретения земельного участка в частную собственность;

1.2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;

2. в течение двух месяцев, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Гомельский межгородской филиал республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него (г. Гомель, ул. Войкова, 87);

3. выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с членами комиссии (по предварительному согласованию).

**Справки по адресу: Гомельский район, агрогородок Еремино, ул. Советская, 150, тел. 96-03-62, тел./факс 96-02-12**

Камертон настрою

# КАЛІ ХОЧАЦЦА СПЯВАЦЬ!

## Маладая сучасніца пра каханне, сям'ю і шчасце

**Ёсць у мяне любімая песня — «Затрымай мяне» беларускага гурта «Aura». Чуць яе даводзілася і ў запісе, і з вуснаў вакалісткі калектыву, названага вышэй, але найбольшае ўражанне гэты музычны твор зрабіў на мяне ў выкананні Юліі Логвін з пасёлка Белавежскі, што на Камянеччыне.**

**Мы з Юліяй неаднаразова сутыкаліся на канцэртах у Камянцы і Высокім, а аднойчы, у 2014-м, ехалі ў адным цягніку Брэст—Мінск: я — дадому, у роднае Маладзечна, яна — на конкурс маладых выканаўцаў, што праходзіў там у рамках фестывалю беларускай песні і паэзіі. Калі сёлета падчас Дня горада ў Камянцы лёс зноў звёў нас, вырашыла: інтэрв'ю быць!**



Юлія нарадзілася ў вёсцы Мікалаева, але роднай для яе стала вёска Войская, куды пазней перабралася сям'я.

— З музыкай у нашай сям'і даўно і надзейна сябруюць усе: мама ў свой час спявала ў хоры, тата таксама ў юнацтве выходзіў на школьную сцэну як вакаліст і баяніст. Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што я, дачка такіх бацькоў, з дзяцінства марыла спяваць. Заўсёды паўтарала: калі-небудзь маё выступленне пакажуць па тэлевізары! Так і атрымалася.

***— Хто дапамагаў табе рабіць першыя крокі да сцэны?***

— У школьныя гады ў мяне былі два цудоўныя педагогі: Іна Заяц з Войскай сярэдняй школы і Любоў Міхнавец з мясцовага Дома культуры. Памятаю, што вельмі хацела вучыцца спяваць уім, але пайсці туды проста так — «Прыміце мяне!» — не хапала смеласці. Потым мяне выпадкова пачула Любоў Іосіфаўна і паклікала займацца.

***— Пасля 11 класа вырашыла абраць прафесію, звязаную з музыкай?***

— Вядома ж! Спынілася на Брэсцкім музычным каледжы імя Рыгора Шырмы. Без пачатковай музычнай адукацыі паступаць туды было няпроста, але справілася. Дзякую за падтрымку начальніку аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Мікалаю Громіку, які даў мне накіраванне, і педагогу Камянецкай дзіцячай школы мастацтваў Ганне Грушэўскай, што займалася са мной перад паступленнем. На тры бюджэтныя месцы прэтэндавалі 12 чалавек, адно з іх дасталася мне.

***— Чым запомніліся тры гады вучобы ў Брэсце?***

— Яны былі вельмі насычаныя! І новымі ведамі, і шматлікімі выступленнямі. Надзвычай удзячная сваім педагогам: па сцэнічным маўленні, выпускніку Расійскага інстытута тэатральнага мастацтва Уладзіміру Яшчуку, і па класе фартэпіяна Жанне Крукавай.

**Маленькі тлумачальны слоўнік Юліі Логвін**

**Спевы — гэта... маё жыццё.**

**Сям'я — гэта... тое, што заўсёды на першым месцы.**

**Каханне — гэта... узаемаразуменне і ўзаемапавага.**

**Шчасце — гэта... калі цябе кахаюць, калі ты сапраўды патрэбны, калі гэта — шчырая праўда, а не ліслівасць.**

Уладзімір Мікалаевіч дапамагаў мне шукаць магчымасці выступаць, знаёміў з цікавымі, таленавітымі людзьмі. У Доме культуры чыгуначнікаў у Брэсце ў яго быў свой тэатр «Люстэрка», куды я прыйшла аднойчы па ўласнай ініцыятыве і захапілася гэтым чараўніцтвам. Памятаю, мы ставілі мюзікл «Ну, воўк, маладзец!», у якім я іграла Зайца. З гэтым спектаклем мы ездзілі ў Люблін і Львоў. Двойчы мне давяралі ролю галоўнай Снягуркі Брэста каля ёлкі на плошчы Леніна. І сёння мы падтрымліваем сувязь з Уладзімірам Мікалаевічам: нядаўна па яго запрашэнні выступала на Дні горада ў абласным цэнтры. Што ж датычыцца Жанны Крукавай, то яна вельмі шмат дала мне за тры гады ў плане ігры на інструменце. Асабліва, калі ўлічыць, што раней я ніколі не іграла на фартэпіяна...

***— Сапраўды, вельмі насычанае творчае жыццё!***

— Мне хацелася зарэкамендаваць сябе. Таму ішла выступаць усюды, дзе была магчымасць. Платна, бясплатна — без розніцы.

***— Так і з конкурсам у Маладзечне?***

— Заяўку на ўдзел у ім падала, нават не здагадваючыся, што выступаць буду цяжарная. Калі ўжо ў Маладзечне падышла да Міхаіла Фінберга, з аркестрам якога выступалі конкурсанты, і спытала, ці дазволіць ён мне выйсці на сцэну на восьмым месяцы, пачула ў адказ просьбу прынесці даведку ад урача, што гэта не пашкодзіць ні мне, ні дзіцяці.

Так і выступала. Вярнулася з дыпломам за ўдзел. Сёлета хацела паспрабаваць зноў, але не склалася...

***— Якія яшчэ перамогі ў тваёй скарбонцы?***

— Адзін дыплом першай ступені абласнога конкурсу «Табе мае песні, Белая Русь» і два другой ступені абласных «Эстраднага міксу» і «Рытмаў маладосці», дыплом фіналіста конкурсу «Дэбют з аркестрам». Акрамя таго, тройчы спрабавала прайсці ў беларускае шоу «Акадэмія талентаў», двойчы — у «Спяваючыя гарады». А яшчэ ў 2012-м ездзіла з сяброўкай на «Х-фактар» ва Украіну. Але няўдала — перад журы, якое паказваюць па тэлебачанні, так і не выступіла, бо гэтаму папярэднічала некалькі прамежкавых этапаў, пераадолець якія змаглі адзінкі.

***— Засмуцілася?***

— Не, гэта карысны досвед. Там проста робяць шоу. Памятаю, перада мной прадзюсар сказала «так» хлопцу, які прыйшоў на кастынг на джамперах — прыстасаваннях для скачкоў — і дзіўным голасам спяваў песню пра «белого лебедя на пруду». Зрабіла для сябе выснову: там трэба ці зрабіць нешта эпатажнае, ці браць, як той казаў, на змор.

***— Што ў найбліжэйшых творчых планах?***

— «Белазаўскі акорд». Гэта рэспубліканскі конкурс маладых эстрадных выканаўцаў. Ён адбудзецца ў кастрычніку.

***— Жадаю поспеху! А пакуль вернемся яшчэ раз у мінулае. Пасля заканчэння каледжа ўладкавалася на працу ў...***

— Белавежскую дзіцячую школу мастацтваў, займалася з дзеткамі вакалам. Бо ў пасёлку жыве і працуе мой муж Косця. Нам выдзелілі дом, у якім вельмі ўтульна і нам, і нашай маленькай Сонечцы. Пасля дэкрэтнага водпуску, што скончыўся нядаўна, уладкавалася ў Белавежскі Дом культуры кіраўніком тэатральнага гуртка, акрамя таго, працую на палову стаўкі ў дзіцячай школе мастацтваў.

***— У мужа таксама творчая прафесія? Як вы пазнаёміліся?***

— Не, ён — інжынер-механік. Вучыліся разам у школе. Я маладзейшая на тры гады і таму, напэўна, асаблівай увагі на Косцю не звяртала. Але аднойчы на дні нараджэння агульнага знаёмага мы сустрэліся позіркамі, і я зразумела: гэта МОЙ чалавек! Сустракаліся пяць гадоў. Доўга гулялі, размаўлялі, гадзінамі ў любое надвор'е сядзелі на лаўцы, ён па лесвіцы да мяне ў акно на другі паверх лазіў... Потым пажаніліся. Было і вянчанне, бо ведаю дакладна: нікога так не буду кахаць.

***— Ты, напэўна, спявала на сваім вяселлі таксама?***

— Як без гэтага? *(Усміхаецца.)* Адну песню прысвяціла маме, мы плакалі з ёй разам, другую, «Каханне, падобнае на сон», — мужу. Нашай сям'і ўжо тры гады.

***— Кажуць, каханне жыве менавіта столькі, а потым знікае...***

— Няпраўда! Каханне жыве вечна. Увогуле звязваць свой лёс з чалавекам без кахання нельга.

***— Хто з вас першы ідзе на прымірэнне пасля спрэчкі?***

— Па чарзе. Мы па гараскопе Рак (я) і Леў (Косця). Абое — лідары, абое ўпартыя. Але гатовы ісці на кампраміс. Я лічу, калі кахаеш чалавека, беражы яго! Мы ўсё робім разам. Не дзелім абавязкі па доме. Сёння шмат гавораць пра мужоў, што выдатна сябе адчуваюць пад абцасам жонкі. На маю ж думку, такіх не існуе. Проста ёсць мужчыны, якія паважаюць сваіх жанчын.

Мой Косця — вялікі працаўнік. Яму не дай есці, а дай папрацаваць *(смяецца)*. Як мне не дай есці, а дай выступіць. У нас пры доме і агарод ёсць, і прылеглую тэрыторыю даводзім да ладу, нядаўна, напрыклад, зладзілі вельмі прыгожы газон, які я ахвотна даглядаю.

***— Дачка пераняла любоў да музыкі?***

— Яна і спявае, і танцуе. Лічу, што бацькі павінны даць дзіцяці ўсё, што можна, паказаць, як шмат у свеце цікавых заняткаў. Малы хлопчык ці дзяўчынка яшчэ не здольны самастойна вырашаць, што ім патрэбна. Няхай жа паспрабуюць усё, а потым самі вызначацца. Галоўнае — каб было з чаго выбіраць.

Мая мама ў свой час шчыра падтрымлівала маё імкненне да спеваў. Яна і сёння ездзіць са мной на ўсе канцэрты, слухае са слязамі на вачах, перажывае і, спадзяюся, ганарыцца мной. Не магу выказаць, як я ёй удзячная!

***— Як падбіраеш свой рэпертуар?***

— Абавязкова ўлічваю, хто будзе мяне слухаць, што можа спадабацца менавіта гэтай публіцы. А яшчэ, вядома ж, спыняюся на кампазіцыях, якія пасуюць мне, дапамагаюць паказаць усе вакальныя здольнасці. Звычайна спяваю песні Ані Лорак, Валерыі, Алы Пугачовай, Ірыны Алегравай.

Люблю павольныя кампазіцыі са зместам. Аб сэнсе жыцця, напрыклад. Асабліва пранізліва атрымліваецца, калі сам перажываеш нешта падобнае на тое, пра што спяваеш. Кожную песню заўсёды прапускаю праз сябе.

**Настасся НАРЭЙКА.**
**Фота Міколы ШУМА і з сямейнага архіва.**



Тое, што ўва мне

## Дарога — рух. Дарога — жыццё...

**Колькі сябе памятаю, мяне заўсёды суправаджаў гул чыгункі. Калі мне было прыкладна пяць, мы з матуляй хадзілі глядзець на цягнікі. Сярод лесапаласы, якая ідзе ўздоўж рэек, знаходзілі найбольш зручнае месца і чакалі, каб памахаць машыністам.**

Колькі ж радасці было, калі з акна цеплавоза нам адказвалі! Дарослыя мужчыны бачылі зачараваны погляд маленькай дзяўчынкі, усміхаліся і махалі рукой, а часам нават рабілі запаветнае «Ту-туу!» — дзеля мяне.

З малых гадоў я езджу ў цягніках: бацька жыве ў іншай вобласці, таму два разы на год прыкладна па пяць гадзін (назад — столькі ж) праводжу ў плацкартным вагоне за чытаннем кніг ці праслухоўваннем музыкі.

Цяпер я студэнтка. Кожнай раніцай а сёмай — ужо ў электрычцы. У ёй я дарэмна спрабую запоўніць недахоп сну. Часам бывае, правальваешся ў яго так глыбока, што не чуеш нават гучных аб'яў назваў станцый. І калі праспала свой прыпынак, то шчасце выглянуць у акно і ўбачыць перон наступнай, а не, напрыклад, дэпо.

З маім маладым чалавекам лёс звёў мяне таксама ў прыгарадным цягніку, які накіроўваўся да сталіцы. Пасля працяглага перапынку ў стасунках мы выпадкова селі ў адзін вагон і прагаварылі ўсю дарогу. З гэтага ў нас усё і пачалося, напэўна. З-за таго, што жывём у розных кутках горада, зноў жа, часцей за ўсё я езджу да яго на электрычцы. У суткі магу мільгаць на чатырох розных перонах. Позна ўначы, раніцай, у чаканні першай, апошняй, хуткаснай, звычайнай электрычкі — я заўсёды там.

Я цвёрда магу сказаць, што дарога — гэта сапраўды мой дом і маё жыццё. Мне ўжо даўно не перашкаджае перастук колаў, калыханне вагона, гутаркі іншых пасажыраў побач, гучныя аб'явы назваў станцый... І нават дома, калі засынаю ў мяккім ложку, лепшай калыханкай для мяне з'яўляецца гул цягніка, які праязджае ўдалечыні.

...Дарога вельмі стамляе, аднімае процьму часу і шмат сіл. Але, нягледзячы на ўсё гэта, ёсць у ёй нешта значнае. Дарога — гэта адвечны рух, адвечны аптымізм, адвечнае жыццё. Гэта сіла, упартасць і моц.

Мне часам здаецца, што чыгунка, якая ўвайшла ў жыццё яшчэ ў маленстве, паўплывала на мой характар. Не ведаю, ці змагла я напоўніцу захаваць сваю дзіцячую ўпартасць і здольнасць не сумаваць. Але ж я намагаюся. І яшчэ ніколі не складала рук, калі магла і хацела нешта змяніць...

...У сваім маленькім горадзе, перасечаным чыгункай, часам я сустракаю дзяцей, якія махаюць услед цягнікам. Гледзячы на такога маленькага чалавека, я думаю аб тым, які шмат яму трэба будзе перажыць і выпрабаваць, як шмат дарог пераадолець. Я заўсёды ў думках жадаю, каб, калі ён падрасце і сутыкнецца з цяжкасцямі, у вачах яго не згас агеньчык дабрыні і надзеі. І каб праз шмат гадоў ён быў здольны радавацца жыццю так, як радуецца цяпер.

Напэўна, машыністы з майго маленства таксама жадалі мне гэтага ж.

## Любі мяне. Таму што я ёсць

**Любі глядзець на тое, як я сплю. Любі маю ўсмешку і мае карыя вочы. Любі водар маіх валасоў. Любі задуменнасць і дзіўныя выказванні, якія ты спрабуеш зразумець, але так і не зразумееш.**

Чытай усё, што я пішу, разглядай дробязі ў маіх малюнках, спрабуючы знайсці ў іх нешта пра сябе, але не знаходзь. Слухай маю музыку, глядзі мае любімыя фільмы, чытай кнігі з маёй паліцы, каб зразумець рух маіх думак. Спрабуй выкліканць мяне на сур'ёзныя размовы, але бойся маёй абыякавасці і спыняйся. Дзеля мяне кладзіся спаць позна ўначы, нават калі прачнаацца на досвітку. Апраўдвай мяне перад усімі, прабачай мне самыя жудасныя рэчы, рабі выгляд, што табе ні кроплі не крыўдна. Адмаўляйся ад усяго дзеля мяне. Будзь мною апантаны...

Але я ўсё роўна не буду кахаць цябе.

**Паліна ПРАКАПЕНЯ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
28 09 2017 г.

SEX-БАЛЯСЫ

# У АКТЫЎНЫМ ПОШУКУ

**Мабыць, не памылюся, калі скажу, што большасць прадстаўнікоў цяперашняй моладзі знаёміцца з процілеглым полам найперш праз сеціва. Такі час, такія норавы... («У інтэрнэце ніхто не ведае, што насамрэч ты — кот».) Вось дзе ўжо можна разысціся напоўніцу! Гэта вам не экспромтам гумарам фантаніраваць, кампліменты ў вочы гаварыць. («Так смешна слухаць ману, калі ведаеш праўду. А перабіваць шкада — чалавек жа стараецца».) Ды што там казаць пра моладзь, калі нават дзеці ў сваіх профілях у сеціве ў графе «сямейнае становішча» (?!) пішуць: у актыўным пошуку! Во як, ні больш, ні менш! («Так... Дзяцінства крута змянілася. Раней у суседзяў яблыкі кралі, а цяпер Wi-Fi».) Не хочацца займацца маралізатарствам, але што нас чакае наперадзе пры такім падыходзе? («— Ты як ажаніўся? — Дзякуючы інтэрнэту. — «УКантакце» будучую жонку знайшоў? — Не, пагуляць выйшаў, калі дома інтэрнэт прапаў. — Дзякуй Богу, у мяне стабільны правайдар».)**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Але, на шчасце, сярод прадстаўнікоў цяперашняга пакалення яшчэ сустракаюцца юнакі і дзяўчаты, якім уласцівы дух авантурызму, такі натуральны для іх папярэднікаў. («— Памятаеш, як мы дзецьмі біліся? — Вой, чым мы толькі не біліся!») Гэта калі яны актыўна спрабуюць пазнаёміцца з прадстаўнікамі процілеглага полу не ў віртуальным свеце, а ў рэальным. («Аб'ява: «Шукаю мужа. Проста Люся, 24 патушаныя хаты, 33 спыненыя кані».) Мабыць, многія бачылі — хто на здымках у інтэрнэце, хто наяве — абвесткі на слупах, прыпынках грамадскага транспарту накшталт «прашу адгукнуцца прыгожую бландзінку, якая ехала ў такі дзень і час у маршруце №...» або «вельмі спадабайся высокі хлопец у чырвонай куртцы, з якім мы перакінуліся парай слоў на прыпынку тыдзень таму, прашу адгукнуцца». Не, напачатку яны павялі сябе як сапраўдныя «батаны», дзеці свайго часу, але потым нешта ж прымусіла іх выйсці са свайго шкарлупіння, адкінуць сарамлівасць і адважыцца на такі крок! («Мы жывём у дзіўны час, дзе хлопец можа ўразіць дзяўчыну, калі проста напіша паведамленне без памылак».)

Класіка жанру ў такой справе — прызнанні на асфальце. Яны быццам бы нагадваюць перапіску ў сеціве, але патрабуюць пэўнай мужнасці. («Ранкам падышла да акна і ўбачыла на асфальце надпіс: «Таня, выходзь за мяне замуж!» Я так радавалася, так радавалася, што не адразу прыгадала: я ж Оля».) Адны такімі надпісамі замілоўваюцца, маўляў, рамантыка, малайчына, сапраўдны кавалер. («Усе мужчыны шукаюць разумную, прыгожую, вясёлую, сексуальную, з кватэрай, машынай, а яшчэ верную і бескарыслівую. Узнікае пытанне: «А вы ёй навошта?») Іншых такія дарослыя графіці раздражняюць. І тое праўда, тут галоўнае не перагнуць у сваёй актыўнасці... («— На белым-белым пакрывале... каханай дзяўчыны імя ён напісаў...» — Пятровіч, ты што робіш?! Гэта ж міліцэйскі пратакол! Пішы, як трэба: «Справіў малую патрэбу пад вокнамі сужыцелькі!»)

Нядаўна вось на слыху былі дзве гісторыі пра тое, як сужэнцаў сабе шукаюць 39-гадовая мінчанка і 27-гадовы жыхар сталіцы. Праз налепкі на аўтамабілях. Жанчына размясціла на сваім лаканічны запіс «Шукаю мужа», хлопец некалькі ўдакладніў пажаданне: «Шукаю жонку, а маці — нявестку». А што, як па мне, дык адразу адчуваецца жыццёвы досвед дамы! (Памятаеце, як было ў савецкім фільме «Масква слязам не верыць»? «— А адкуль ён узяўся? — З электрычкі. — Віншую. Ты ўжо пачала ў транспарце знаёміцца. Не чакала ад цябе. — Шчыра кажучы, я сама ад сябе не чакала».) Гэта вам не пакаленне інтэрнэту! («Мы лашчылі адно аднаго курсорамі па фатаграфіях. Ананімна. Узаемна. Інтымна».) Тут усё сапраўды актыўна і досыць празрыста. (Са «Службовага рамана»: «Вера, выклічце мне Навасельцава!») Наколькі эфектыўны такі спосаб знаёмства, можна меркаваць па тым, што толькі за тыдзень наяўнасці на аўто налепкі ў сярэдняй мінчанкі тэлефанавалі па тры разы за дзень, яна кожны вечар хадзіла на новае спатканне. («Маладая сімпатычная дзяўчына, ласкавая, без шкодных звычак прадасць оптам 20 тон цэменту».) Праўда, пакуль ні адзін з патэнцыяльных кавалераў жанчыне не спадабаўся, таму спыняць пошукі яна не плануе. І тое праўда, чаго спяшацца з высновамі? («Хто пасля расставання больш не маніторыць ранейшых і не сочыць за іх жыццямі, той нават круцейшы за героя ў баевікоў, якія не павернуцца на выбух».)

Ды і ў хлопца таксама не ўсё так гладка: за некалькі месяцаў яму патэлефанавалі ўсяго з дзясятак дзяўчат. Яны па большасці чамусьці ўспрымаюць заклік-прапанову маладога чалавека як жарт. («Аб'ява на сайце знаёмстваў. «Толькі сур'ёзныя адносіны! Я высокая, стройная, прыгожая. Люблю скакаць, катацца і смяяцца. Патрэбны батут, шафёр і клоўн».) Можа, мінчаніну проста варта крыху падкарэкціраваць тэкст, не палохаць з самага пачатку маладзіц свекрывёй? («— У тваіх равеснікаў ужо жонкі, дзеці, машыны, іпатэка! — Гучыць так, быццам бы віноўнік усіх гэтых бедстваў — я».)

У любым выпадку абодва шукальнікі сваіх патэнцыяльных другіх палавінак — малайцы. Пагадзіцеся, смеласці і актыўнасці, пачуцця гумару ім не займаць. А ўсё дзеля чаго? У імя самага галоўнага — кахання. («Гэты вы ў кавярню можаце схадзіць з кім заўгодна. А раздзяліць пад покрывам ночы патэльню смажанай бульбачкі дастойны толькі выбраны».) Так што ўсім удачы ў пошуках!

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Хачу быць найлепшай ва ўсім»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

***— Што ў паўэрліфтынгу самае галоўнае?***

— Мяркую, псіхалогія. Пачаць займацца гэтым відам спорту можа любы, нават не маючы нейкіх асаблівых фізічных даных. Калі казаць пра мяне, то ў дзяцінстве я ніколі не займалася ў спартыўных секцыях, ды і магчымасці нават такой не было, таму што я нарадзілася ў вёсцы Церабуты Старадарожскага раёна. Калі паступіла ў сельскагаспадарчую акадэмію ў Горках, трэнер заўважыў мяне выпадкова, але адразу не сказаў пра паўэрліфтынг, а проста запрасіў на заняткі фітнесам. Тыдзень думала, а потым вырашыла прыйсці паглядзець, што там за фітнес. Была дзяўчынкай з вагой 45 кілаграмаў, але ў трэнажорнай зале паказала сваю сілу і трэнер сказаў, што я таленавітая і дакладна выканаю нарматыў на майстра спорту, стану чэмпіёнкай Беларусі. Я паступала ў БДЭУ ў Мінску на эканаміста, але не хапіла літаральна аднаго бала, таму вырашыла паехаць у Горкі вучыцца на бухгалтара. Атрымліваецца, што той бал змяніў усё маё жыццё, бо ў сталіцы я б дакладна паўэрліфтынгам не займалася.

***— Выходзіць, паказваць добрыя вынікі вы сталі адразу?***

— Я пачала ставіць перад сабой мэты, першая — выканаць разрад кандыдата ў майстры спорту. Думала, гэта вельмі складана, але зрабіла нарматыў за месяц. Зразумела, што здольная на большае. Выканала майстра спорту, потым паехала на чэмпіянат Еўропы і стала там срэбраным прызёрам.

***— А якую максімальную вагу вы здольныя падняць?***

— Не магу сказаць, таму што я яшчэ ніколі не выступала на сваім максімуме. З кожным годам, кожнай трэніроўкай паказчыкі растуць, але я не ведаю сваёй мяжы.

***— У чым сакрэт вашай сілы?***

— Магчыма, у генах. Трэнер кажа, што ў мяне здольнасць, як быццам дар ад Бога. Я не ўжываю нават мінімальнага спартыўнага харчавання, хоць бы проста для падтрымання арганізма. Толькі ўласныя рэсурсы. Многіх гэта здзіўляе.

***— Падымаць цяжар небяспечна для любога чалавека, а для дзяўчыны асабліва...***




— У мяне вельмі катэгарычная пазіцыя наконт здароўя, яно для мяне больш важнае, чым спорт. Усяго, чаго хацела (і нават больш), я дамаглася, таму калі ўзнікне нейкая пагроза здароўю, я адразу, без роздуму, кіну спорт. Калі б паўэрліфтынг быў прадстаўлены на Алімпіядзе, то яшчэ было б да чаго імкнуцца, куды расці, а так, куды дзець усе гэтыя медалі?

***— Вы, напэўна, часта сутыкаецеся з пытаннем пра тое, навошта далікатнай дзяўчыне займацца такім відам спорту?***

— Калі бацькі пачулі, што я буду падымаць штангі, адразу сказалі — не. Гэта іх пазіцыя, яе яны прытрымліваюцца і цяпер, але, нягледзячы на тое, што выступаюць супраць майго занятку, усё роўна ганарацца дачкой. Для мяне гэта важна. Што да рэакцыі іншых людзей, у твар ніхто нічога мне не выказваў, магчыма, за спінай хтосьці асуджае мой выбар. Але, напрыклад, аднакурснікі, наадварот, ганарацца мной, падтрымліваюць і заўсёды віншуюць з поспехамі.

***— Ва ўсіх спартсменаў, як правіла, моцны характар, бо без гэтага немагчыма дамагчыся выніку. Ці складана сумяшчаць яго з жаноцкасцю?***

— Пасля таго, як я пачала займацца паўэрліфтынгам, характар дакладна стаў больш жорсткім, з'явіўся стрыжань. Калі раней была ціхай і маўклівай, то цяпер часам даводзіцца нават стрымліваць сябе. Але спадзяюся, што мне ўдалося захаваць жаноцкасць. Я люблю, калі, нягледзячы на тое, што я чэмпіёнка свету ў такім відзе спорту, ува мне ўсё роўна, перш за ўсё, бачаць дзяўчыну, якая мае патрэбу ў дапамозе.

***— Ці важны для вас знешні выгляд у працэсе спаборніцтваў?***

— Наогул пра гэта не думаю. Калі выходзіш на памост, нікога не заўважаеш, нічога не чуеш, арыентуешся толькі па жэстах суддзі. Адрэналін зашкальвае. Думаеш толькі пра тое, як правільна зрабіць практыкаванне, а не пра тое, што не паспела нафарбавацца.

***— Мяркуючы па вашых поспехах у вучобе, вы разбураеце стэрэатып пра разумовыя здольнасці спартсменаў...***

— Вядома, мне складана падтрымліваць сваю фізічную форму (трэніруюся чатыры разы на тыдзень па дзве—чатыры гадзіны), ды яшчэ і добра вучыцца ў акадэміі, але я хачу быць найлепшай ва ўсім. Мой сярэдні бал — 10. Я пішу артыкулы, навуковыя работы, выступаю на конкурсах навуковых даследаванняў. У нашай навучальнай установе няма палёгкі для спартсменаў. У першую чаргу чалавек прыходзіць туды вучыцца, а калі паспявае яшчэ чымсьці займацца, — калі ласка.

***— Дзе знаходзіце сілы і час?***

— Шчыра? Не ведаю. Бывае вельмі складана, у такія моманты хочацца апусціць рукі, але матывую сама сябе тым, што зроблена ўжо вельмі шмат.

***— У далейшым збіраецеся працаваць бухгалтарам або працягнеце спартыўную кар'еру?***

— Некалькі гадоў у любым выпадку адпрацую па размеркаванні, якраз будзе магчымасць «адчуць» прафесію. Але думаю, усё ж такі выберу для сябе іншую спецыяльнасць, больш актыўную. Мне ўжо паступалі прапановы працаваць фітнес-інструктарам, пакуль я іх не прыняла. Што датычыцца паўэрліфтынгу, гэта апошні год, калі я выступаю на спаборніцтвах. Буду падтрымліваць форму толькі для сябе. Напэўна, лепш ужо пачынаць рыхтаваць іншых да вялікага спорту, чым выступаць самой. Мне здаецца, я змагла б быць строгім, але добрым трэнерам. У трэнажорнай зале да мяне часта звяртаюцца па парады нават хлопцы.




**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
lobazhevich@zviazda.by

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 27.09.2017 г.

# БУДОЎЛІ ТЫСЯЧАГОДДЗЯ



Перспектыўны выгляд пуцеправода пасля рэканструкцыі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Варта адзначыць, што ўвядзенне ў строй Заходняга абходу не толькі вырашыць праблему затораў на чыгуначных пераездах паўночнай часткі горада і вызваліць цэнтральныя вуліцы ад велікагрузаў. У перспектыве магістраль злучыць аўтадарогі Р-17 Брэст — мяжа Украіны і М1 Брэст — Масква, а таксама міжнародныя аўтамабільныя пункты пропуску «Брэст — Цярэспаль» і «Казловічы — Кукурыкі».

Цяпер асноўная будаўнічая пляцоўка размяшчаецца на скрыжаванні вуліц Лейтэнанта Рабцава і Брэсцкіх Дывізій. У некалькіх месяцах гэты аўтамабільны вузел перасякаюць чыгуначныя пуці. Прывычнай для горада карцінай сталі вялікія чэргі перад закрытымі шлагбаўмамі. Гараджане, што жывуць у гэтым раёне, навучыліся падстройвацца пад рух цягнікоў. Здавалася, так будзе вечна. Але з пачаткам будаўніцтва стала зразумела, што праблема закрытых шлагбаўмаў і доўгага стаяння перад імі будзе канчаткова вырашана.

Тым часам завяршаецца будаўніцтва двух дзясяткаў дамоў сядзібнага тыпу. Скажаце: пры чым тут жыллё? А яно — працяг вышэйназванага праекта. Справа ў тым, што жыхароў прыватнага сектара па вуліцы Палаўскага, дзе пройдзе новы пуцеправод, давялося адсяліць. Як нярэдка бывае ў такіх выпадках, рашэнне далося нялёгка абодвум бакам. Прайшло некалькі сходаў, у тым ліку ў гарвыканкаме. Былі слёзы, эмоцыі, прэтэнзіі. Але ж кансэнсусу ў рэшце рэшт удалося дасягнуць. Людзям прапанавалі новыя дамы ў іншым месцы ўзамен тых, якія сталі фактычна ўпрытык да ажыўленай трасы. І абсалютная большасць гаспадароў толькі выйграе ад хуткага перасялення. А некаторыя наогул са старых нягеглых хацін пераедуць у новыя прыгожыя добраўпарадкаваныя катэджы. Такі вось падарунак ім выпаў з нагоды 1000-гадовага юбілею роднага горада.

## Кобрынскі мост

Вышэйназваная транспартная развязка ўступіць у строй да канца юбілейнага 2019-га года. Як і Кобрынскі мост. Гэтае збудаванне асаблівае для горада. Яно было ўзведзена на ўсходняй ускраіне Брэст-Літоўска ў пачатку XX стагоддзя, па ім фактычна праходзіла мяжа горада і раёна. Цяпер мост знаходзіцца ў самым цэнтры горада. Яго ўсходні з'езд злучаны з вуліцай Маскоўскай, якая пераходзіць у трасу М1. Цікава, што пуцеправод дзеліць вуліцу на дзве часткі, адна з якіх называецца, як было сказана, Маскоўская, другая ў 1990-х гадах стала праспектам Машэрава.

Дык вось, апошнюю сваю рэканструкцыю Кобрынскі мост перажыў у 1960-я гады — тады ў збудавання паявілася пешаходная частка. Ён служыў многім пакаленням гараджан. І цяперашнія спецыялісты аддаюць належнае папярэднікам, якія сто гадоў таму з тагачаснымі тэхналогіямі, матэрыяламі, тэхнікай узвялі аб'ект, што і сёння служыць. Але ж зразумела, што ён даўно састарэў і маральна, і фізічна.

Прыйшла і яго чарга. Зацверджаны праект, і распачаты падрыхтоўчыя работы да рэканструкцыі, якая пройдзе ў два этапы. «Падрыхтоўчы этап — гэта перанос камунікацый — цеплатрасы, водаправода, каналізацыі, сетак сувязі, — расказвае **галоўны інжынер прадпрыемства «Брэстдарпраект» Руслан ГАРБАЧУК**. — Ужо вядзецца дэмантаж пабудоў, зносяцца дрэвы, якія стаяць на шляху будучага аб'екта».

Мост знаходзіцца на самай ажыўленай трасе горада. Яго замену будаўнікі ўзяліся правесці без спынення руху па існуючым. Таму пуцеправод будзе ствараецца з дзвюх частак. Першая з'явіцца з левага боку (у напрамку з цэнтра). Як толькі першую частку здадуць у эксплуатацыю, сюды перамесціцца транспартны паток, пачнецца разборка старога моста і будаўніцтва другой часткі новага. У абодвух напрамках новага моста будзе па тры паласы шырынёй 3,5 метра кожная плюс паласа бяспекі ў паўметра і трохметровыя тратуары з абодвух бакоў. Святлафор на з'ездзе з пуцеправода ў цэнтр будзе ліквідаваны, каб не тармазіць рух. Затое тут з'явіцца падземны пераход. Прадугледжаныя лесвічныя сходы з моста для пешаходаў. Выводзіць яны будуць у бок прылеглых вуліц. Таксама з'явіцца пралёт для з'езда на вуліцу Кастрычніцкую да Палескага вакзала. Адным з момантаў паляпшэння Маскоўскай стане ўпарадкаванне руху на праблемных участках выездаў з вуліц Сікорскага і Генерала Папова.

Цяперашнія праекціроўшчыкі запэўніваюць, што новы аб'ект стане не толькі камфортным транспартным збудаваннем. Пуцеправод будзе сапраўдным архітэктурным упрыгажэннем горада і паслужыць многім пакаленням. Дзеля гэтага варта і пацярпець нязручнасці. На час будаўніцтва плануецца прапускаць па старым мосце толькі грамадскі транспарт і машыны экстранных службаў, астатнім давядзецца рухацца ў аб'езд.

## Ёсць такая канцэпцыя

Акрамя рэалізацыі маштабных праектаў, якія былі названыя, запланавана яшчэ вялікая перад'юбілейная работа. Нядаўна парадак яе абмеркавалі дэпутаты гарадскога Савета на сваёй сесіі. Яны зацвердзілі канцэпцыю святкавання юбілею горада. Паводле інфармацыі намесніка старшыні гарвыканкама Мікалая Якубоўскага, на капітальны рамонт жылых дамоў ужо выдзелена 10 мільёнаў рублёў. За тры гады іх будзе адрамантавана больш за 200, напрыклад, раней даводзілася абнаўляць каля 25 шматпавярховікаў за год. Мадэрнізацыя чакае многія вуліцы, дваровыя тэрыторыі, паркі і скверы. У праграму падрыхтоўкі да юбілею ўвайшло таксама будаўніцтва новага аўтавакзала, медыцынскіх, спартыўных, адукацыйных устаноў.

У праграму-канцэпцыю святкавання ўключаны шэраг мерапрыемстваў: фестывалі, конкурсы, розныя канферэнцыі, гісторыка-культурныя і спартыўныя мерапрыемствы, урачыстыя адкрыцці новых аб'ектаў. Іх праводзіцца нямала. Напрыклад, гараджане актыўна ўдзельнічалі ў выбары эмблемы 1000-годдзя горада. І яна ўжо ёсць.

Кульмінацыяй святкавання павінна стаць маляўнічае шоу пад назвай «Міленіум» у верасні. Запланавана прэзентацыя нашага абласнога цэнтра ў штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы недзе на кастрычнік-лістапад 2019 года.

Усё гэта цудоўна. Але нельга не пагадзіцца са старшынёй Брэсцкага гарадскога Савета дэпутатаў Мікалаем Красоўскім, які падкрэсліў, што на шляху падрыхтоўкі вельмі важнымі выглядаюць ініцыятывы саміх гараджан і актыўны ўдзел кожнага ў перадсвяточным паляпшэнні роднага горада... Напрыклад, жыхары пад'езда, дзе жыве аўтар гэтых радкоў, сабралі грошы на рамонт першага паверха, і работы пачаліся. Калі мы не спынімся на дасягнутым, ды адолеем рамонт усяго пад'езда, гэта значыць абновім прастору свайго штодзённага існавання, то і настрой у юбілейныя дні будзе значна лепшы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

---

■ Спадчына

# БЕЛАРУСКІ СТАЛЫПІН

## Чаму Эдварда Вайніловіча параўноўваюць з прэм'ер-міністрам Расійскай імперыі?

**У кастрычніку спаўняецца 170 гадоў з часу нараджэння Эдварда Антонія Леанарда Вайніловіча. Яго імя цесна звязана са Случчынай. Таму менавіта тут і была зладжана міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Беларусь, Слуцкі край і Эдвард Вайніловіч».**

Намеснік дырэктара Інстытута гісторыі па навуковай рабоце Нацыянальнай акадэміі навук Вадзім Лакіза адзначыў, што ў апошнія гады стала добрай традыцыяй праведзенне навуковых канферэнцый, прысвечаных розным аспектам гісторыі рэгіёнаў. Сучасныя ўмовы даследаванняў сведчаць, што ў Беларусі шмат таленавітых асоб, якія ў розныя перыяды ўнеслі значны ўклад у розныя сферы грамадскага жыцця. Але доўга гісторыю Беларусі і яе выдатных прадстаўнікоў згадвалі толькі ў сувязі з савецкім часам. Апошнія 20 гадоў у незалежнай Беларусі разгорнута вялікая работа па аднаўленні незаслужана забытых імён. У гэтай кагорце і Эдвард Вайніловіч.

Ён нарадзіўся 13 кастрычніка 1847 года ў вёсцы Сляпянка пад Мінскам у сядзібе бацькоў яго маці — Эдварда і Міхаліны Манюшкаў. Гэта была заможная шляхецкая сям'я. Бацькі Эдварда — Адам Вайніловіч і Ганна Ваньковіч — пражывалі ў радавым памесці Савічы Слуцкага павета. Род Вайніловічаў належаў да заможнай шляхты. Ён адзін з нямногіх, хто здолеў захаваць сваё уладанні і не паддаўся ўплыву Радзівілаў: «Род наш ні перад кім шапку не здымаў. Калі амаль уся шляхта былога Навагрудскага ваяводства запасіла свае багацці з крошак радзівілаўскага стала і з заложнікаў выйшла ў гаспадары, мы ні адзінай пядзі зямлі ад іх не ўзялі. Ва ўсёй шырокай акрузе Савічы, адзіныя, адзіне памесце — непасляпрадзівілаўскае».

— Спадчына, якую пакінуў Вайніловіч у беларускай гісторыі, надзвычай шматгранная, — канстатаваў Вадзім Лакіза. — Ён вучыўся ў Слуцкай кальвіністкай гімназіі, з'яўляўся ганаровым суддзёй Слуцкага павета, узначальваў Слуцкае таварыства дабрачыннасці, стаў пачынальнікам сельскагаспадарчых выставак у Слуцку, стварыў першакласную сістэму гаспадарання на зямлі, асаблівую ўвагу ўдзяляў распаўсюджванню беларускай мовы.

Падкрэсліваючы цесную сувязь са Случчынай, Эдвард Вайніловіч пісаў: «Вайніловічы не прыйшлі ані з Усходу, ані з Захаду, а з'яўляюцца карэннымі, мясцовымі людзьмі. Косць ад косці, кроў ад крыві свайго народа, які калісь хаваў сваіх продкаў у тых курганах, што і цяпер ёсць на старых могілках».

Вайніловіч пабываў у шмат якіх замежных краінах, але вярнуўся на Случчыну і пераўтварыў яе ў самы паспяховы сельскагаспадарчы рэгіён, куды прыязджалі па вопыт калегі з Польшчы, Прыбалтыкі, Расіі, Украіны. Нярэдка яго параўноўваюць з прэм'ер-міністрам Расійскай імперыі Пятром Сталыпіным. Сапраўды, гэта былі добрыя гаспадарнікі, рэфарматары, якія настойліва дабіваліся пастаўленых мэт, выступалі супраць усялякіх рэвалюцый, людзі неўтаймаванай энергіі.

Доктар гістарычных навук, прафесар Міхаіл Касцюк у сваёй работа





це даследаваў эвалюцыю грамадскіх поглядаў і дзеяння Эдварда Вайніловіча.

— Ёсць сур'ёзныя сведчанні аб тым, што Сталыпін меркаваў у недалёкай перспектыве зрабіць Вайніловіча міністрам сельскай гаспадаркі Расійскай імперыі. Але прапанаваў яму толькі крэсла віцэ-міністра — на гэта былі розныя прычыны. За што прасіў прабачэння ў беларуса, — расказаў Міхаіл Паўлавіч. — Ёсць абгрунтаваныя падставы меркаваць, што рэформу ў аграрным сектары прапанаваў Пятру Сталыпіну менавіта наш зямляк.

У 1917 годзе падчас нямецкай акупацыі ад імя мясцовых землеўласнікаў ён выступіў за аднаўленне Вялікага Княства Літоўскага.

Эдвард Вайніловіч — чалавек высокай маралі і духоўнасці, глыбока веруючы, высакародны. Пра гэта сведчаць шматлікія факты з яго жыцця. Менавіта на іх спыніўся Уладзіслаў Завальнюк, пробашч сталічнай парафіі Святых Сымона і Алены. Пасля таго як заўчасна пайшлі з жыцця дзеці Вайніловіча, ён сказаў: «Перарвалася маё яднанне з маім родам і я застаўся адзін, як тое абвугленае дрэва». Але ён знайшоў у сабе сілы вярнуцца да жыцця, цалкам аддаваў сябе грамадскай дзейнасці, людзям, дапамагаў сіротам, дзецям з бедных сем'яў атрымліваць адукацыю, на што не шкадаваў асабістых грошай.

У 1917 годзе падчас рэвалюцыі сяляне спалілі сядзібу Вайніловічаў. Згарэлі галандскія ветраныя млыны, унікальная бібліятэка — 5000 рэдкіх кніг, вялікая карцінная галерэя. Але самае крыўднае — архіў Вайніловічаў, які збіралі на працягу 400 гадоў. Засталіся толькі руіны старога бровара. Але Эдварду Вайніловічу дапамагла перанесці ўдар лёсу яго глыбокая вера.

Калі прыйшлі палякі, то на тэрыторыі былой сядзібы ўладкавалі вясельні для пакарання тых, хто зруйнаваў велічны палац. Але Эдвард Вайніловіч папрасіў, каб не чапалі сялян, бо яны не разумелі, што робяць.

Памёр грамадскі дзеяч, палітык, мысліцель, мецэнат 16 чэрвеня 1928 года пасля працяглай хваробы. У канцы свайго дзённіка ён напісаў простыя, поўныя пакоры словы: «Відаць, з гэтай хваробы не выйду: на ўсё воля Божая. Э. Вайніловіч. 16 чэрвеня 1928 года». Яго пахавалі ў Быгшчыцы (Польшча). Ён заўсёды марыў ляжаць побач са сваімі продкамі, бацькамі, дзецьмі Сымонам і Аленай, у кургане на старых могілках у Савічах. І толькі ў 2006 годзе астанкі чалавека, які так шмат зрабіў для Беларусі, былі перавезены ў Мінск у Чырвоны касцёл, які ён пабудаваў на свае сродкі ў гонар рана спачылых дзяцей.

Помнячы пра маральныя і чалавечыя якасці Эдварда Вайніловіча, Каталіцкая царква падрыхтавала дакументы для яго беатыфікацыі.

**«Сталыпін меркаваў у недалёкай перспектыве зрабіць Вайніловіча міністрам сельскай гаспадаркі Расійскай імперыі».**

Свой уклад у даследаванне жыцця і дзейнасці Эдварда Вайніловіча ўнеслі і школьнікі горада і раёна. Яны прадставілі на конкурс свае работы, дзе праанадізавалі шматлікія факты яго біяграфіі. Менавіта вучні прапанавалі ўвекавечыць памяць выдатнага земляка стварэннем музея.

У межах мерапрыемства даследчыкі з Мінска прэзентавалі кнігу гісторыка Мікалая Волкава «Слуцк на старажытных планах», якая выйшла з друку летам гэтага года.

Удзельнікі канферэнцыі азнаёміліся з выстаўкай «Дакументальная спадчына Беларусі XVI—XIX стагоддзяў: архіў Слуцкага Свята-Троіцкага манастыра», наведалі музей слуцкіх паясоў.

Арганізавалі міжнародны форум Слуцкі райвыканкам, Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Рымска-каталіцкі касцёл у Беларусі і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже тепличного комплекса, принадлежащего ОАО «Нафтан»

**Лот №1. Состав лота:**

1. **Капитальное строение**: тепличный комплекс с инвентарным номером 250/С-37773. Назначение: здание специализированное растениеводства. Г. п. – 1994. Число этажей – 1. Общая площадь – 42601,4 кв. м. Санитарно-электротехнические работы: центральное отопление – стальные трубы; водопровод – стальные трубы; электроосвещение – открытая проводка; радио – есть; телефон – есть; горячее водоснабжение – стальные трубы; вентиляция – принудительная; канализация – чугунные трубы. Примечания: Материал стен: стекло в металлическом каркасе, сендвич-панели.
2. **Оборудование**: перечень реализуемого оборудования приведен на сайте ino.by.

Местоположение: Витебская обл., Полоцкий р-н, Боровухский с/с, д. Гвоздово, ул. Земляничная, 12

| Начальная цена без учета НДС – 2 915 374,52 бел. руб. | Задаток, бел. руб. – 150 000,00 |
|---|---|

**СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ**

Земельный участок площадью 10,8567 га с кадастровым номером 223881401601000039. Целевое назначение земельного участка: для использования под тепличное хозяйство (код 1 11 00 – земельный участок для размещения объектов промышленности). Право постоянного пользования. Ограничения (обременения) прав в использовании земель, в связи с его расположением в пределах территорий перспективного развития населенного пункта (города Новополоцка) на площади 10,8567. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 50 (пятидесяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона.
2. Полная оплата стоимости приобретенного на аукционе Объекта производится по определенному договором купли-продажи соглашению сторон.
3. Определенная в ходе аукциона цена продажи Объекта будет увеличена на сумму налога на добавленную стоимость (НДС) согласно законодательству Республики Беларусь.
4. До полной оплаты стоимости приобретенного на аукционе Объекта он находится в залоге у Продавца.

Обязанность по государственной регистрации договора залога (ипотеки) возлагается на Победителя аукциона (Претендента на покупку).

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан:

– согласовать с Полоцким районным исполнительным комитетом условия выделения ему земельного участка, необходимого для содержания и обслуживания приобретенного на аукционе Объекта, с внесением в установленном законодательством порядке изменений в землеустроительное дело;

– с даты передачи Объекта заключить с Продавцом договор аренды недвижимого имущества: капитальное строение – электроосвещение (инв. № в ЕГРНИ 250/С-43023) и капитальное строение – дороги и площадки (инв. № в ЕГРНИ 250/С-43022), связанные общим назначением и расположенные на одном земельном участке с Объектом, без которых его эксплуатация невозможна.

Размер арендной платы в месяц, в том числе НДС (20%) за пользование капитальным строением дороги и площадки (инв. № в ЕГРНИ 250/С-43022), – 60,0 базовых арендных величин; за пользование капитальным строением электроосвещение (инв. № в ЕГРНИ 250/С-43023) – 14,0 базовых арендных величин.

6. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору вознаграждение в размере 0,5% (ноль целых пять десятых процента) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
7. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 10.10.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Продавец:** ОАО «Нафтан» 220441, Витебская область, г. Новополоцк, тел. 8 (0214) 59-82-57.

**Организатор аукциона**: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11 пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже тепличного комплекса, принадлежащего ОАО «Нафтан», проводимом 10 октября 2017 г.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. **Окончание приема заявлений:** 06.10.2017 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов: Дорожко Сергей Леонидович,тел.: 8 (0214) 59-00-67, 8 (029) 592-13-24.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

«Утерянные страховые полиса формы 2РН серии БГБ в количестве 1 шт. №0397626, «Добровольное страхование имущества граждан», 2РН (2РП) страховой полис Каско серии ТСН в количестве 1 шт. №100950 в филиале Белгосстраха по Минской области считать недействительными.

УНП 100122726

## РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

## «ВЫИГРЫВАЙТЕ НА ЗДОРОВЬЕ!»

В период с 3 июля по 27 августа 2017 года на территории Республики Беларусь была проведена рекламная игра «Выигрывайте на здоровье!» Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №3048 от 28 июня 2017 года выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

Организатором рекламной игры выступило Общество с ограниченной ответственностью «Агентство Маркетинговых Коммуникаций «РЭПКА», Республика Беларусь, 22007, г. Минск, ул. Ольшевского, 20/11, оф. 21, почтовый адрес: 220073, Минск, ул. Ольшевского, 20/11-509, УНП 191728827, ОКПО 380626185000.

Период проведения рекламной игры с 3 июля 2017 года по 13 сентября 2017 года.

За период проведения рекламной игры были зарегистрированы 173 человека. Из них соответствующими правилам рекламной игры были признаны 173 человека.

Призовой фонд рекламной игры «Выигрывайте на здоровье!» был разыгран полностью.

Победители главных призов:

**Подарочный сертификат ООО «ЛОДЭ» на медицинские услуги, номиналом 1 300,00 белорусских рублей + денежное вознаграждение в размере 177,67 белорусских рублей – 4 шт.:**

1. Ястребов Сергей Геннадьевич, г. Минск.
2. Дедков Игорь Иванович, г. Минск.
3. Курбан Дарья Александровна, г. Минск.
4. Канаш-Вайчик Анна Андреевна, г. Минск.

Телефоны для справок: +375 44 726 90 08, +375 33 300 99 78.

**Поздравляем победителей!**

## Извещение о проведении 16 октября 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)

| № | Наименование | Инв. номер | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | установка для очистки масла мод. Д4/2, год выпуска – 1996 | 4250198 | г. Минск, ул. Социалистическая, 2 | 2 640,00 | 264,00 |
| 2. | станок для балансировки шлифовальных дисков мод. E-ORE, год выпуска – 1960 | 4250200 | | 1 500,00 | 150,00 |
| 3. | полуавтомат зуборезный мод. 5А270В, год выпуска – 1999 | 4239356 | | 8 960,00 | 896,00 |
| 4. | полуавтомат зуборезный мод. 5А270В, год выпуска – 1999 | 4239357 | | 8 960,00 | 896,00 |
| 5. | полуавтомат зуборезный мод. 5А270В, год выпуска – 1999 | 4239358 | | 9 200,00 | 920,00 |
| 6. | полуавтомат зуборезный мод. 5А270В, год выпуска – 1999 | 4239359 | | 8 960,00 | 896,00 |
| 7. | полуавтомат зуборезный мод. 5А270В, год выпуска – 1999 | 4239390 | | 9 200,00 | 920,00 |
| 8. | полуавтомат зуборезный мод. 5А270В, год выпуска – 1999 | 4239391 | | 8 960,00 | 896,00 |
| 9. | полуавтомат зуборезный мод. 5С280П, год выпуска – 1980 | 4220623 | | 4 600,00 | 460,00 |

Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной Дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся 16 октября 2017 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 28.09.2017 по 12.10.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 217-96-37, 217-98-79 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»)

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 12 октября 2017 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 50% после вторых несостоявшихся торгов по продаже автотранспортного средства, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Коминтерн» на праве собственности

| № лота | Наименование, краткая характеристика объекта | Начальная цена, рублей (в т. ч. НДС по ставке 20%) | Задаток, рублей (в т. ч. НДС по ставке 20%) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль ГАЗ 2705 435,** рег. знак АВ 7602-3, год выпуска 2004, цвет красно-бордовый. Номер кузова (рамы): 27050040124710 ХТН27050040373500. Тип: грузопассажирский фургон. Вид топлива – бензин. Объем двигателя – 2460 см куб. Местонахождение автомобиля: г. Гомель, ул. Интернациональная, 5 | **960,00** | **96,00** |

Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 11 октября 2017 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **12 октября 2017 г**.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; индивидуальный предприниматель – паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором аукциона; представитель индивидуального предпринимателя – паспорт и доверенность; представитель юридического лица (резидент РБ) – паспорт (руководитель – копию приказа, протокола о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидент РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY84ALFA30122305700080270000) в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 28 сентября 2017 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (единственным участником, выразившим согласие купить Объект), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить Объект), Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить объект) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере четыре процента от цены продажи Объекта, сформированной в установленном порядке; в течение 10 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить Объект) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за Объект, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты проведения аукциона.

*Извещение о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту было опубликовано в газете «Звязда» от 01.03.2017 г. №41, от 22.06.2017 г. №117*

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. • 8 (0232) 32-46-47; 32-00-71 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by. Продавец: ОАО «Коминтерн», г. Гомель, ул. Интернациональная, 5. • 8 (0232) 75-65-94; 8 (029) 192-37-18 •**

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже земельного участка в собственность в г. Гродно (микрорайон «Зарица-4») 24 октября 2017 года

